Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

19 ЖНІЎНЯ 2009 г.
СЕРАДА
№ 154
(26512)

Кошт 550 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Беларускія будаўнікі ўзводзяць жыллё за мяжой

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 18 жніўня прыняў з дакладам Старшыню Праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Пятра Пракаповіча.

Аляксандру Лукашэнку даложана аб выкананні шэрагу даручэнняў кіраўніка дзяржавы. У прыватнасці, гаворка ішла пра тое, якія меры прынятыя ў гэтым годзе па забеспячэнні будаўніцтва жылля, пра меры, якія прымаюцца ўрадам і аблвыканкамамі па выкананні заданняў па будаўніцтве ў Беларусі 8 млн кв. м жылля ў 2010 годзе. Таксама Прэзідэнт быў праінфармаваны аб рабоце беларускіх будаўнікоў па ўзвядзенні жылля за межамі Беларусі, гэта значыць аб экспарце будаўнічых паслуг.

Акрамя таго, гаворка ішла пра работу 12 сельгасарганізацый, якія замацаваныя за Нацыянальным банкам. Усе даручэнні Прэзідэнта, што датычацца іх работы, выконваюцца. Асаблівая ўвага на сустрэчы была нададзена распрацоўцы праграмы развіцця Прыпяцкага Палесся, якая ахоплівае 7 раёнаў Беларусі, што прымыкаюць да ракі Прыпяць. Прэзідэнту таксама даложана аб выкананні яго даручэнняў па правядзенні эксперыменту на базе ААТ «Александрыйскае», а таксама гаспадарак у Пружанскім і Шклоўскім раёнах.

Пры вырашэнні гаспадарчых спрэчак у Беларусі ўсё часцей выкарыстоўваецца інстытут пасрэдніцтва

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 18 жніўня 2009 года прыняў з дакладам старшыню Вышэйшага гаспадарчага суда Беларусі, старшыню Беларускай федэрацыі баскетбола Віктара Камянкова.

У гэтым годзе адзначаны рост колькасці зваротаў суб'ектаў гаспадарання і дзяржорганаў у гаспадарчыя суды: у студзені—чэрвені іх колькасць перасягнула 57,5 тыс. Гэта азначае, што сярэднямесячная нагрузка на аднаго суддзю выраслa да 97 спраў і знаходзіцца на граніным узроўні. У такой сітуацыі ВГС не ініцыіраваў павелічэння колькасці працуючых у гэтай сферы, а прапанаваў спрасціць многія працэдуры разгляду гаспадарчых спрэчак. Прыняты меры, накіраваныя на прававую прапаганду пераваг спрошчаных і альтэрнатыўных формаў вырашэння спрэчак. У прыватнасці, актыўна выкарыстоўваецца інстытут пасрэдніцтва, з дапамогай якога 80 працэнтаў спраў, якія трапілі ў гэту працэдуру, вырашаюцца міравым пагадненнем. Прэзідэнту быў прадстаўлены праект закона, які прадугледжвае ўнясенне змяненняў у заканадаўства ў частцы мінімізацыі затрат на правядзенне судовых працэдур, пашырэння выпадкаў абавязковага прэтэнзійнага парадку ўрэгулявання спрэчкі па асобных катэгорыях спраў і па іншых пытаннях. Прэзідэнт у цэлым адобрыў прапановы ВГС.

Закранаючы спартыўныя пытанні, Віктар Камянкоў далажыў Прэзідэнту, што ў Беларусі ў цэлым сфарміравана сістэма кіравання спортам, але прававое рэгуляванне адносінаў у гэтай сферы неабходна ўдасканальваць. Акрамя таго, у краіне адсутнічае падрыхтоўка юрыстаў, якія спецыялізуюцца ў галіне спорту. Таму, калі ўзнікаюць міжнародныя спрэчкі, Беларусі даводзіцца плаціць немалыя сродкі, каб юрысты з Францыі, Расіі і іншых краін суправаджалі гэтыя спрэчкі. Што датычыцца баскетбола, то, паводле слоў кіраўніка федэрацыі, у краіне неабходна актыўна развіваць матэрыяльна-тэхнічную базу для гэтага віду спорту. У прыватнасці, Мінску не хапае добрых трэніровачных залаў для нацыянальных камандаў высокага ўзроўню. Прэзідэнт прапанаваў Віктару Камянкову падрыхтаваць адпаведныя праекты дакументаў па гэтых пытаннях і ўнесці яму на разгляд.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Дзівакі ўпрыгожваюць свет

16 000 КОРКАЎ НА ФАСАДЗЕ

Жыхар горада Рагачова Аляксандр Русецкі, каб не часта фарбаваць фасад свайго дома, вырашыў аздобіць яго пластыкавымі бутэлькамі з-пад піва, мінералкі, фанты і колы. Гэты «будматэрыял» ён збірае на беразе Друці, побач з якой жыве, там пасля нядзельнага адпачынку гараджан ім услана ледзь не ўся тэрыторыя. Такім чынам Аляксандр змагаецца за чысціню экалогіі. Агароджу перад фасадам ён зрабіў з цэлых піўных двухлітровак, франтон абабіў донцамі «палтарачак», а на плошчу паміж вокнамі прыбіў каля 16 тысяч коркаў. Нядаўна вецер папсаваў на агародзе яшчэ не старую грушу, і гаспадар вырашыў ператварыць яе ў пальму з малпай і папугаем. Будматэрыял зялёнага колеру яму прыносяць суседзі і знаёмыя. Цяпер гаспадар цэлыя дні праводзіць на дрэве, прыбівае «лістоту».

— Калі людзі глядзяць на мой дом з усмешкаю, мне гэта падабаецца, — кажа незвычайны рагачоўскі архітэктар.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гадуй сваё!

КАРОВА Ў РАСТЭРМІНОЎКУ

Сельская гаспадарка ў Слаўгарадскім раёне выдзяляе сваім працаўнікам беспрацэнтную пазыку на набыццё жывёлы: грамадскі статак павялічыўся напалову.

У вёсцы Урэчча Слаўгарадскага раёна маладая шматдзетная гаспадыня Валянціна Міхаськова набыла другую карову.

— Заробкі ў нас з мужам не самыя вялікія, а грошы, каб гадаваць дзяцей, вельмі патрэбныя, — тлумачыць санітарка мясцовага ФАПа.

Карова каштуе сёння нятанна — да 2-х мільёнаў рублёў, а таму старшыня Васькавіцкага сельсавета Аляксандра Плехава асабіста абышла кожную хату ў акрузе з добрай навіной пра льготныя ўмовы набыцця жывёлы.

СВК «17-ты партз'езд» выдзяляе беспрацэнтную пазыку на карову: можна плаціць часткамі з зароблку і грошай за здадзенае малако, хоць і паўгода.

— Мы грошы ўжо выплацілі: цяпер штодня здаём да 40 літраў малака, і з дзвюх кароў маем прыбытак у месяц 500—600 тысяч рублёў, — гаворыць Валянціна.

Набыла карову і суседка Міхальковай, якая гадуе траіх дзяцей. Аплата ў растэрміноўку без працэнтаў прыйшлася даспадобы даяркам з мясцовай фермы. А ўсяго ў «17-м партз'ездзе» сёлета скарысталіся прапановай гаспадаркі больш за два дзясяткі сялянскіх сем'яў. Яны лічаць, што падсобная гаспадарка — гэта выгадная справа.

Некалькі гадоў таму на хвалі набліжэння да гарадскога ладу жыцця і шырокіх магчымасцяў набыцця недарагіх харчоў у кожнай вясковай краме людзі сталі пазбаўляцца ад жывёлы ў гаспадарцы.

— Такі працэс быў, але мы яго спынілі, — запэўнівае старшыня Слаўгарадскага раённага Савета дэпутатаў Таццяна Кананчук. — Летась у нашым раёне на асабістых падворках стала менш усяго на 10 кароў.

Кананчук упэўнена, што большасць сельскага насельніцтва — людзі працалюбівыя, а ходкае меркаванне пра нежаданне сялян трымаць падсобную гаспадарку — не зусім праўда.

— Проста хочацца, каб гэта праца і выдаткі кампенсаваліся добрымі даходамі, — лічыць кіраўнік раённага Савета. — Калі чалавек бачыць, што, які б там ні быў заробак, а падсобная гаспадарка заўсёды дасць харчы і грошы, то людзей не трэба пераконваць трымаць каровy і свіней. Дадатковы стымул у тым, што натуральныя харчы вельмі важныя для здароўя чалавека.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

46 ВЁСАК ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ ЭЛЕКТРЫЧНАСЦІ

У Аршанскім раёне ў выніку моцнага ветру з-за пашкоджання ліній электрапередач 46 населеных пунктаў, 21 ферма засталіся без электрычнасці. Было таксама парушана энергазабеспячэнне 103 трансфарматарных падстанцый.

Як паведамілі «Звяздзе» ў абласным упраўленні МНС, былі аператыўна прынятыя меры па барацьбе з вынікамі стыхіі. Прымаліся дрэвы, якія ўпалі на дарогі і дахі на тэрыторыі чатырох населеных пунктаў, а таксама ў райцэнтры. Ніхто з людзей ад стыхіі не пацярпеў. Страты падлічваюцца.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

У АВАРЫІ ЗАГІНУЎ ДЫРЭКТАР

У выніку дарожна-транспартнага здарэння ў вёсцы Зубава Аршанскага раёна за рулём свайго «Фальксвагена» загінуў дырэктар Аршанскага камбіната будаўнічых матэрыялаў: а восьмай гадзіны раніцы ён не справіўся з кіраваннем, у выніку чаго машына сутыкнулася з дрэвам. Па факце ДТЗ разбіраюцца ў ДАІ Аршанскага раёна.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

БЕТОНАМЯШАЛКА ПЕРАКУЛІЛАСЯ НА МКАД

Аварыя з удзелам аўтамашыны МАЗ адбылася на мінскай кальцавой аўтадарозе.

— Бетонамяшалка рухалася па 1-й паласе МКАД у кірунку Партызанскага праспекта, — распавёў **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе Заводскага аддзялення ДАІ горада Мінска Максім КАЧЫНСКІ.** — Раптам з другараднай дарогі на першую паласу выскачыў «Фальксваген-Т4». Кіроўцу МАЗа нічога не заставалася, як прымяніць экстраннае тармажэнне і, каб пазбегнуць сутыкнення, рэзка манеўраваць на другую паласу. У выніку шматтонны грузавік пераламаў раздзяляльны турнікет, выскачыў на знешнюю паласу сустрэчнага руху і перакуліўся. Пры гэтым бетонамяшалка зачапіла аўтамашыну «БМВ», якая рухалася ў спадарожным кірунку. У аварыі, на шчасце, людзі не пацярпелі. Дзве аўтамашыны — МАЗ і «БМВ» — атрымалі сур'ёзныя механічныя пашкоджанні. Кіроўца «Фальксвагена» з месца здарэння ўцёк. Але, дзякуючы відавочцам, якія паспелі запісаць нумар яго аўтамабіля, віноўнік аварыі знойдзены.

Надзея ДРЫЛА.

КАМУНАЛЬНЫЯ ПЛАЦЯЖЫ: РОСТ НА 17,7 %

У параўнанні са снежнем мінулага года. Такія звесткі прыводзіць Нацыянальны статыстычны камітэт.

Гэта ў сярэднім. Калі ж браць па пазіцыях, якія былі «зрушаны», то найбольшы рост адзначаўся па электразабеспячэнні — 19,3 %. Плацяжы за водазабеспячэнне за вызначаны перыяд павялічыліся на 18,4 працэнта, за тэхнічнае абслугоўванне жылых памяшканняў — на 11,9 %, а за газазабеспячэнне — на 2,8 %. Увогуле расцэнкі на платныя паслугі насельніцтву ў параўнанні са снежнем мінулага года ўзраслі на 11,2 працэнта. Найбольшы рост — на міжнародныя чыгуначныя перавозкі (на 47,8 %). На адпаведныя перавозкі ўнутрырэспубліканскага прызначэння тарыфы павялічыліся нязначна (на 0,8 %), а на прыгарадныя паездкі і ўвогуле зменшыліся (на 5,5 %). Без змяненняў заставаліся расцэнкі на паездкі ў гарадскім транспарце, а таксама на прыгарадных і міжгародніх маршрутах. Павялічыліся хіба толькі расцэнкі на паветраных «магістралях» (на 29,3 %). Сярод паслуг, на якія быў адзначаны найбольшы рост цэнаў, — турысцка-экскурсійныя (24,7 %), санаторна-аздараўляльныя (17,1 %), дашкольных устаноў (на 15,6 %), а таксама наведванні канцэртных залаў (на 9,4 %) і тэатраў (на 9 %). За адпаведны час цэны на медыцынскія паслугі «плюсанулі» на 2,3 працэнта.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ТРОЕ НАЛЁТЧЫКАЎ АБРАБАВАЛІ Ў АРШАНСКІМ РАЁНЕ КРАМУ НА BR15 ТЫС.

Пра гэта карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі.

Злачынства было ўчынена ў вёсцы Засеклі ў Аршанскім раёне. Схаваўшы твары пад капронавымі панчохамі чорнага колеру, злачынцы ўварваліся ў краму і сталі патрабаваць грошы ў касіра. Не разгубіўшыся, прадавец стала складваць у пакет усё, што ёй трапляла пад руку. У выніку зладзеі, якія нічога не западозрылі, выйшлі з крамы з таварам на агульную суму Br15 тыс. Усе затрыманы.

Гучная справа

У Салігорску затрымалі банду вымагальнікаў

У Салігорску затрымалі банду вымагальнікаў на чале з крымінальным аўтарытэтам, паведаміла начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі Святлана Бароўская.

Супрацоўнікі галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю МУС затрымалі за вымаганне раней неаднаразова судзімага грамадзяніна па мянушцы Еля, 1970 года нараджэння. Сумесна з двума членамі падкантрольнай яму злачыннай групы з лістапада 2008 года, пагражаючы прымяненнем гвалту, ён вымагаў $3,5 тыс. і атрымаў ад рабочага аднаго з прадпрыемстваў горада больш як $2 тыс.

Затрыманне стала магчымым дзякуючы карпатлівай працы аператыўнікаў ГУБАЗ і мясцовага аддзела крымінальнага вышуку, якая вялася імі каля года (з таго часу як у ліпені 2008 года па рашэнні членаў крымінальнага асяродку Еля быў выбраны «наглядчыкам» і трымалнікам зладзейскага «абшчаку» Салігорска).

Кіраўніцтва ГУБАЗ МУС адзначае, што пасля шматгадовага зацішша крымінальны элемент ажыццяўляе спробы кансалідацыі злачыннага асяродку, адраджэння строгай іерархіі і падпарадкаванасці.

Вядома, што для падняцця свайго аўтарытэту сярод раней судзімых, затрыманы Еля падтрымліваў адносіны са злодзеем у законе Біруковым (Біра), які пражываў у Маскве і якому Еля перадаваў грашовыя сродкі са зладзейскага «абшчаку» Салігорска. Акрамя таго, фінансавая падтрымка аказвалася асобам, якія адбывалі пакаранне за ўчыненне цяжкіх злачынстваў у папраўчых калоніях Магілёва, Гродна і Ваўкавыска.

Кар. БЕЛТА.

Купляй сваё — жыві лепш!

СЕЗОН «СЛАВЯНКІ»

Даследаванні спажывецкага рынку і рэалізацыя з адтэрміноўкай плацяжоў — сакрэт поспеху бабруйскіх швейнікаў

— Мы не затавараны, вешалкі пустыя, адгрузка ідзе «з колаў», — каментуе Тамара Дудаль, якая кіруе камплектовачным цэхам.

На партыю адзення для школьнікаў — касцюмы з чорнай тканіны ў някідкую палоску — ужо прыладжана паперка з пунктам прызначэння: гандлёвы дом «Няміга». Менавіта ў сталіцы прадаецца палова школьнай формы, астатняя частка — у іншых беларускіх гарадах і Расіі. Дзіцячае адзенне дзелавога стылю ацанілі нават у расійскай сетцы гіпермаркетаў «Ашан».

— Цяпер мы тэрмінова шыем партыі школьнага адзення для хлопчыкаў трэцяй групы па паўнаце, — паказвае **намеснік дырэктара па камерцыйных пытаннях Юрый ДРОБАЎ.** — Гандаль ахвотна бярэ форму для схільных да паўнаты дзяцей.

Здольнасць спрагназаваць, калі хочаце — проста ўгадаць, што будзе патрэбна на рынку — адзін з галоўных складнікаў поспеху.

— Не зарыентаваўся своечасова — прапаў! — гаворыць Ю. Дробаў. — Школьную форму выбіраюць шмат фабрык у Беларусі, і выбар ёсць. І пытанне ў тым, што пашыць, каб гэта выбралі і набылі.

Напрыклад, калі ў мінулым сезоне дзяўчаткі аддавалі перавагу касцюмам, то сёлета — толькі сарафанам і кашулям з яркай тканіны. Гэта падказалі традыцыйныя паказы ў бабруйскіх школах, без якіх не абыходзіцца стварэнне ніводнай калекцыі формы.

Даследаванні рынку выявілі таксама, што найбольшай папулярнасцю ў школьнікаў карыстаецца адзенне найвышэйшага «VIP-класа»: бацькі імкнуцца набыць сваім дзецям самае лепшае.

Вядомыя кішэні для сотавых тэлефонаў, якія абараняюць дзяцей ад апраменьвання, а таксама для плэераў — гэта знаходка бабруйскіх мадэльераў добра спрацавала на папулярнасць школьнай формы ад «Славянкі».

Калі казаць шчыра, то яшчэ ўвесну склад прадпрыемства меў зусім іншы выгляд. У красавіку тут было назапашана прадукцыі на 3 мільярды рублёў — гэта больш за месячны аб'ём прадукцыі. Аднак назапашванне на «Славянцы» назвалі падрыхтоўкай да сезона, і цяпер складскі запас не дацягвае да 1,5 мільярда рублёў, а гэта ніжэй за нарматыў.

— Мы яшчэ летась сталі аддаваць у гандаль сваю прадукцыю

У адным з цэхаў «Славянкі» цяпер шыюць курткі і паліто па замове вядомай маскоўскай фірмы.

з адтэрміноўкай плацяжу на 90 дзён, — расказаў Юрый Дробаў пра эканамічны складнік барацьбы з затаваранасцю складаў. — Мы не чакалі загадаў зверху, а сталі ўжываць гэты метад для рэалізацыі прадукцыі. Бачым, што ён нармальны, правільны. А ўвогуле сакрэт паспяховай рэалізацыі — гэта штодзённая карпатлівая праца.

Пакуль на суседніх прадпрыемствах ідзе вострая барацьба за разгрузку складаў гатовай прадукцыі, на «Славянцы» штодня сустракаюць 13-15 буйных пакупнікоў. Прычым забіраюць яны не толькі школьную форму, але і іншае адзенне на восеньскі сезон — курткі і паліто. Карыстаюцца попытам і спартыўныя калекцыі: тут адбіваецца вопыт працы на вядомыя ў свеце фірмы па вытворчасці спартыўнага адзення.

Бярэцца «Славянка» і за выгадныя заказы з сыравіны заказчыка: без іх швачнаму прадпрыемству сёння не выжыць. У Бабруйску шыюць для фінаў, англічан і французаў, але найбольш — для расіян.

У адным з цэхаў шыюць курткі і паліто для маскоўскай фірмы. Модныя тканіны з мудрагелістымі ўзорамі ператвараюцца ў стыльныя вырабы. Працаўніцы ў цэху прыхільна пазіраюць на шыкоўнае адзенне, але ўсё яно адправіцца ў Маскву. Праўда, гавораць, набыць яго можна і ў бабруйскай краме непадалёк, але па вельмі прыстойных цэнах: прыватнік набывае пашытыя ў родным горадзе курткі і паліто ўжо ў Расіі.

Калі напачатку крызіснага года расійскія фірмы надта баяліся падзення попыту і нават скасоўвалі свае заказы, то цяпер яны вярнуліся на «Славянку».

— У нас добрая рэпутацыя, і ў ліпені было так шмат заказаў на пашыў, што мы вымушаны былі часткай падзяліцца са сваімі канкурэнтамі, — прызнаецца Юрый Дробаў. — У нас усе магутнасці загружаны пад завязку. Два цэхі ў сельскім раёне, у пасёлку Глуша і ваенным гарадку Цэль, таксама працуюць на поўную магутнасць.

Напачатку года на прадпрыемстве меркавалі, што можа даводзецца адпраўляць работнікаў у вымушаны водпуск, а цяпер не хочуць адпускаць людзей і ў чарговы адпачынак. Кіраўніцтва лагічна лічыць, што калі ёсць магчымасць зарабіць грошы — трэба ісці і рабіць, а не гуляць.

«Славянка» сёння — адзін з лідараў сярод прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці. На іншых праблем болей, але і там становішча не лічаць катастрафічным.

Напрыклад, частку сваіх заказаў бабруйчане перадалі магілёўскай швачнай фабрыцы «Вяснянка». Гэта прадпрыемства цяпер называюць як адмоўны прыклад па назапашванні гатовай прадукцыі: калі на пачатку года на складах знаходзіўся 131% ад месячнай вытворчасці, то цяпер — амаль 400 %.

— Аднак гэты чатырохмесячны запас мы ўжо пачынаем актыўна адгружаць, — зазначыла **дырэктар ЗАТ «Вяснянка» Наталля БЯРГОВІНА.** — У нас сезонная прадукцыя — цёплае верхняе адзенне, якое толькі зараз пачынае цікавіць спажыўца. Мяркую, што ад жніўня да кастрычніка мы разгрузім склады і ўкладзёмся ў нарматыў.

Ілона ІВАНОВА.

Бабруйск—Магілёў.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

АРЫШТАВАНЫЯ 8 ЗАХОПНІКАЎ ARCTIC SEA — ГРАМАДЗЯНЕ ЛАТВІІ, ЭСТОНІІ І РАСІІ

Міністр абароны РФ Анатоль Сердзюкоў даклаў Вярхоўнаму галоўнакамандуючаму і прэзідэнту РФ Дзмітрыю Мядзведзеву аб тым, што арыштаваныя 8 грамадзян Эстоніі, Латвіі і Расіі, якіх падазраюць у захопе экіпажа сухагруза Arctic Sea.

Як адзначыў Сердзюкоў, маракі супрацьлодачнага карабля «Ладны» вызвалілі судна без адзінага стрэлу. Сухагруз быў знойдзены ў 1.00 ночы па маскоўскім часе ў 300 мілях ад Выспаў Зялёнага мыса. Пазней, адказваючы на пытанне журналістаў аб сітуацыі з сухагрузам, Анатоль Сердзюкоў падкрэсліў, што гэта быў пірацкі захоп.

ЭКАНОМІКУ УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ МОЖА ЧАКАЦЬ ДАЛЕЙШАЕ ПАДЗЕННЕ

У той час як Захад выбіраецца з крызісу, такія краіны, як Румынія, Балгарыя і Харватыя, працягваюць каціцца па нахіленай, піша Berliner Zeitung.

Першыя прыкметы пераадолення крызісу адзначаныя ў Германіі, Францыі і Японіі. У той жа час многім усходнееўрапейскім краінам яшчэ толькі давядзецца перажыць найгоршыя часы, адзначае выданне. Так, у Румыніі спад эканомікі толькі паскорыўся — за другі квартал ён склаў на 2 працэнтныя пункты больш, чым чакалася. І ў Харватыі гадавы прагноз быў адкарэктаваны на 4% у мінус. Горш, чым у астатніх, справы ідуць ва Украіне і ў Латвіі — там не відаць нават святла ў канцы тунэлю.

КАСІРА СОЙМА ЛІТВЫ ЗВОЛЬНІЛІ ЗА РАСТРАТУ

З парламента Літвы за растрату звольненая Рэгіна Петкелене, якая займала пасаду бухгалтара-касіра. Аб гэтым паведамляе Delfi.lt. Петкелене праходзіць па справе аб прысваенні 400 тысяч літаў (больш за 160 тысяч долараў).

Аб знікненні значнай сумы грошай з парламенцкай касы стала вядома ў сярэдзіне ліпеня. Нястача, паводле інфармацыі агенцтва, была выяўленая падчас інвентарызацыі. На допытах, як паведамляецца, супрацоўніца сойма таксама распавяла, што пазычала грошы з касы некаторым дэпутатам. Па інфармацыі Delfi.lt, «аб нястачы грошай у парламенце ведалі многія, таму штогадовыя праверкі былі фармальнасцю».

ПАЖАР НА ВЯСЕЛЛІ Ў КУВЕЙЦЕ ЎЧЫНІЛА БЫЛАЯ ЖОНКА ЖАНІХА

У Кувейце працягваецца расследаванне страшнага пажару, які адбыўся ў суботу позна ўвечар на вяселлі ў горадзе Джахра. У выніку агню, які ўспыхнуў у вясельным шатры, прызначаным для жанчын, загінулі 43 чалавекі, у тым ліку дзеці. Яшчэ прынамсі 90 чалавек атрымалі раненні.

Як піша брытанская газета The Times, у наўмысным злачынстве прызналася 23-гадовая былая жонка жаніха. Жанчына распаўляла паліцыі, што разліла бензін у шатры і падпаліла яго. Шацёр быў з тканіны і імгненна ўспыхнуў. Паводле слоў жанчыны, яна хацела адпомсціць былому мужу за яго «дрэнныя паводзіны» перад разводам.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.08.2009 г. (для б/н разлікаў)

▼1 долар ЗША	2 849,00	1 эстонская крона	257,51
▼1 еўра	4 025,35	1 польскі злоты	966,04
1 латвійскі лат	5 762,54	▲1 расійскі рубель	89,26
1 літоўскі літ	1 166,62	1 украінская грыўня	342,26

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк», расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 25 АВГУСТА 2009 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. О согласовании договора о взаимодействии с учреждениями образования.

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 22 августа), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 25 августа) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

Дата окончания приема бюллетеней – до 22 августа 2009 года.

Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 84 73.

УНП 100325912.

Ва Урадзе

ІНВЕСТЫЦЫІ ЯК КРЫНІЦА ЭКАНАМІЧНАГА РОСТУ

Пытанні інвестыцыйнай дзейнасці ў краіне за першае паўгоддзе 2009 года былі разгледжаны ўчора на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў. Яно прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага.

Нягледзячы на цяжкасці, звязаныя з сусветным фінансава-эканамічным крызісам, на сёння ў Беларусі захоўваецца станоўчая тэндэнцыя выканання паказчыкаў па інвестыцыях. «Практычна ўжо цяпер можна канстатаваць, што паказчыкі, вызначаныя праграмай на 2006—2010 гады, будуць датэрмінова выкананы ўжо сёлета», — сказаў **першы намеснік міністра эканомікі Пётр ЖАБКО.** Аднак, каб не страціць дасягнутых пазіцый і атрымаць эканамічную аддачу ад інвестыцыйнага працэсу, неабходна працягваць напружаную работу па падрыхтоўцы і разглядзе інвестыцыйных прапаноў, а таксама па рэалізацыі інвестпраектаў.

На пачатку года планавалася ўстанавіць планку па прыцягненні інвестыцый на ўзроўні 125 працэнтаў. «Выкананне гэтага паказчыка, — сказаў П. Жабко, — можна патрабаваць. Але калі выходзіць з рэалій, крыніц прыцягнення інвестыцый і наяўных напрацовак, такое патрабаванне можа паслужыць штуршком да неэфектыўнага выкарыстання інвестыцыйных сродкаў, таму тэмпы росту інвестыцый на ўзроўні 117—118 працэнтаў на канец 2009 года — гэта тая вышыня, якую ўзяць рэальна».

У прыватнасці, паводле яго слоў, прапануецца ўстанавіць мінімальны парог па тэмпах росту інвестыцый у асноўны капітал для Мінпрама, Мінэнерга ў памеры 105 працэнтаў да ўзроўню 2008 года, Мінсувязі, Мінтранса, Мінгандлю — 123 працэнты, канцэрна «Белнафтахім» — 120 працэнтаў і г.д. Для актывізацыі інвестыцыйнай дзейнасці працягваецца работа па ўдасканаленні адпаведнага заканадаўства. Прыняты Дэкрэт Прэзідэнта № 10 і Указ № 413, дзейнічаюць пастановы Урада, якія накіраваны на далейшае паляпшэнне інвестыцыйнага клімату. Гэтыя дакументы павінны стаць нагодай для аднаўлення кантактаў і з замежнымі інвестарамі, якія пакуль занялі чакальную пазіцыю.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

Сярэдняя зарплата ў прамысловасці была ў чэрвені на 6,5 працэнта вышэйшая, чым у сярэднім па Беларусі

На прамысловых прадпрыемствах Беларусі сярэдняя заработная плата ў чэрвені гэтага года склала Br1 млн 80,6 тыс.

Найбольш высокі ўзровень аплаты працы склаўся на прадпрыемствах нафтаперапрацоўчай прамысловасці — Br2 млн 91,4 тыс., чорнай металургіі — Br1 млн 495,3 тыс., хімічнай прамысловасці — Br1 млн 458,2 тыс. У будаўнічых арганізацыях у красавіку 2009 года сярэдняя зарплата склала Br1 млн 401,8 тыс. У арганізацыях транспарту сярэдняя зарплата дасягнула Br1 млн 163,4 тыс. У сельскай гаспадарцы — Br700,2 тыс.

Запазычанасць арганізацый па крэдытах і пазыках на выплату заработнай платы па стану на 1 ліпеня 2009 года была Br827,5 млрд, або 24,2 працэнта ад налічанага за месяц фонду заработнай платы. Найбольш высокая ўдзельная вага запазычанасці склалася ў арганізацыях канцэрнаў «Беллегпрам» (83 працэнты ад налічанага фонду заработнай платы) і «Беллеспаперапрам» (68,6 працэнта), а таксама ў арганізацыях Мінпрама (74,5 працэнта) і Мінбудархітэктуры (53,5 працэнта).

Рэальная зарплата бюджэтнікаў за чэрвень узрасла на 4,3 працэнта

У Беларусі сярэдняя заработная плата ў галінах бюджэтнай сферы ў чэрвені гэтага года склала Br820,7 тыс., паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. У параўнанні з маем 2009 года гэты паказчык павялічыўся на 4,7 працэнта.

У арганізацыях аховы здароўя сярэдняя заработная плата ў чэрвені гэтага года склалася ў памеры Br824,7 тыс., у тым ліку ўрачоў — Br1 млн 424,6 тыс., сярэдняга медыцынскага персаналу — Br804,3 тыс., малодшага медыцынскага персаналу — Br501,1 тыс.

Сярэдні заработак ва ўстановах адукацыі рэспублікі ў чэрвені гэтага года склаў Br745,9 тыс., у тым ліку настаўнікаў — Br845,2 тыс., прафесарска-выкладчыцкага складу — Br1 млн 851 тыс. У арганізацыях навукі і навуковага абслугоўвання гэты паказчык склаў Br1 млн 401,4 тыс.

БЕЛТА.

ЛІТАРАЛЬНАЯ ЗВЯЗДА гісторыя

У МІНСКУ ЗНОЎ ПАНУЕ СТЫХІЯ, НОВАЕ ДАСЯГНЕННЕ МАРКОНІ І НЕВЕРАГОДНАЯ ЗНАХОДКА ДУСЁНКА.

Пра што яшчэ пісала «Звязда» ў 30-ых гадах мінулага стагоддзя?

17 жніўня 1937 года.

«Учора ў Менску прайшоў вялікі лівень. Ліўнем затоплен рад паўпадвальных кватэр горада. У прыватнасці былі затоплены чатыры паўпадвальныя кватэры дома №9 і адна кватэра ў доме №11 па Нямігскаму завулку. (...) Для выкачвання вады з кватэр прыбыла пажарная каманда. 4 сям'і пераселены з затопленых кватэр.»

«Прага, 16 жніўня (БЕЛТА). Згодна паведамлення газет, на выстаўцы ў Дусельдорфе паказаны новыя «апошнія дасягненні германскай навукі» ў галіне сурагатаў. Між іншым, на выстаўцы дэманструецца масла і мыла з вугалю.»

18 жніўня 1937 года.

«Нядаўна брыгадзір калгаса «Новае жыццё», Ганчанскага сельсавета, Клічаўскага раёна, Фама Харлап па дарозе ў Ганчанскую краму згубіў кісет з 209 рубл., грашыма і вайсковым білетам. Па дарозе ішлі піянеры Корбут Міхаіл і Муселька Міхаіл, якія і знайшлі гэты кісет. Піянеры дагналі Харлапа і вярнулі яму яго згубу.»

20 жніўня 1932 года.

«Лёндан,18. Як паведамляе міланскі карэспандэнт «Таймс», Марконі вынайшаў спосаб сувязі па бяздротавым тэлеграфу па кароткахвалевай сыстэме. Ужываючы невялікі апарат з партатыўным рэфлектарам, Марконі з'вязаўся з Рыму з Сардыніяй на адлегласьці каля 170 міль па хвалі ў 57 сант., што да гэтага часу прызнавалася немагчымым з прычыны крывізны земнай кулі.»

21 жніўня 1935 года.

«Дзяржаўнае выдавецтва БССР выдае на яўрэйскай мове творы класікаў сусветнай літаратуры. Ужо вышлі з друку на яўрэйскай мове «Юлі Цэзар», «Гамлет», і «Ромео і Джульета» Шэкспіра. Знаходзіцца ў друку «Атэлло» Шэкспіра.»

21 жніўня 1937 года.

«У Камарынскім раёне мясцовы жыхар Фама Дусёнок знайшоў на глыбіні метра вялікі камень, маючы аплаўленыя бакі і пакрыты жалезнай коркай. Аб гэтай знаходцы даведаліся працуючыя ў раёне супрацоўнікі геалагічнай экспедыцыі Акадэміі Навук БССР. Яны ўстанавілі, што гэты камень з'яўляецца метэарытам, час падзення якога пакуль цяжка вызначыць.»

Падрыхтаваў Тарас ШЧЫРЫ.

ЛЕПШ ВУЧЫЦЦА Ў БЕЛАРУСІ, ЧЫМ У РАСІІ

Адукацыя

1 верасня за школьныя парты сядуць у Беларусі 89 тысяч першакласнікаў (гэта на 4 тысячы чалавек менш, чым у папярэднім годзе). Усяго ў школы, гімназіі і ліцэі прыйдуць 1 млн 58 тысяч хлопчыкаў і дзяўчатак (летась навучаліся 1 млн 102 тыс. чалавек). А з улікам выхаванцаў дзіцячых дашкольных устаноў, студэнтаў і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў новы навучальны год распачнецца для 2 мільёнаў беларусаў.

Як паведаміла на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры **намеснік міністра адукацыі Таццяна КАВАЛЁВА,** да 1 верасня плануецца ўвесці ў строй чатыры новыя школы (дзве з іх у Мінску) і тры дзіцячыя садкі. Разам з тым будуць зачыненыя 97 малакамплектныя школы ў сельскай мясцовасці.

— Пры прыняцці рашэння аб закрыцці ў сельскім населеным пункце навучальнай установы ў першую чаргу бярэцца пад увагу тое, ці магчыма там арганізаваць вучэбны працэс на належным узроўні і ці можам мы гарантаваць дзецям бяспечныя ўмовы навучання, — запэўніла Таццяна Кавалёва — бо нярэдка эканамічна больш выгадна пабудаваць новую школу ці арганізаваць падвоз дзяцей у суседнія навучальныя ўстановы, чым рэканструяваць стары будынак з пячным ацяпленнем. Але вырашэнне пытання з падвозам дзяцей — абавязковая ўмова пры закрыцці малакамплектных школ. І, як мы бачым, неразумення з боку бацькоў з кожным годам становіцца ўсё менш, паколькі яны не менш за нас заклапочаны якаснай арганізацыяй навучальнага працэсу... Зразумела, што кожнаму хочацца, каб школа ці дзіцячы садок былі размешчаны бліжэй да дому. У сталіцы, напрыклад, увядзенне ў строй дзіцячых дашкольных устаноў адстае ад развіцця мікрараёнаў-новабудоўляў, затое ў цэнтры горада дзіцячыя садкі пустуюць. Можа атрымацца так, што праз пэўны час і новыя садкі таксама будуць пуставаць Таму трэба думаць на перспектыву.

Па словах Таццяны Кавалёвай, 2009/2010 навучальны год стане апошнім годам, калі ў школе яшчэ захаваюцца штрых-класы і пераходныя праграмы. Як і ў папярэднім навучальным годзе, па 12 вучэбных прадметах у 11-х штрых-класах даведзецца задзейнічаць электронныя версіі падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, паколькі выданне падручнікаў, якія будуць выкарыстоўвацца толькі адзін год, эканамічна немэтазгоднае. Дарэчы, зараз разглядаецца магчымасць укаранення на выхадзе са школы яшчэ аднаго абавязковага экзамену — па замежнай мове. Валоданне сучасным чалавекам хоць адной замежнай мовай на гутарковым узроўні — гэта патрэба часу, таму экзамен будзе праводзіцца ў вуснай форме. Праўда, пакуль не вызначана дакладная дата яго ўвядзення, але выпускнікоў 2010 года гэта новаўвядзенне дакладна не закране. Плата за карыстанне школьнымі падручнікамі, як і ў папярэднія гады, будзе складаць 50 працэнтаў ад іх кошту і вагацца ў розных класах ад 10 да 24 тысяч рублёў. Для шматдзетных сем'яў плата будзе складаць 25 працэнтаў ад кошту камплекта падручнікаў.

Адказваючы на пытанні журналістаў наконт перспектыў атрымання жылля ў інтэрнатах студэнтамі і навучэнцамі сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, Таццяна Кавалёва паведаміла, што найбольш востра праблема дэфіцыту месцаў у інтэрнатах стаіць для студэнтаў сталічных вышэйшых навучальных устаноў, паколькі ў Мінск з'язджаецца моладзь з усёй краіны. Колькасць студэнтаў за апошнія дзесяць гадоў у нашай краіне павялічылася ўдвая, а колькасць месцаў у інтэрнатах засталася ранейшая ці нават зменшылася, паколькі многім інтэрнатам патрабуецца капітальны рамонт. І калі інтэрнаты планава не зачыняць на капітальны рамонт, то праз некалькі гадоў сітуацыя дадаткова пагоршыцца. У Мінску забяспечаны жыллём у інтэрнатах будуць толькі каля 60 працэнтаў студэнтаў, а па краіне — 63 працэнты. Да канца гэтага года плануецца засяліць першы інтэрнат у Студэнцкай вёсцы, які прыме студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Навасельцамі стануць і студэнты Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, для якіх быў пабудаваны новы корпус інтэрната. Дарэчы, зараз плата за пражыванне ў інтэрнатах каштуе для студэнтаў ВНУ штомесяц усяго каля 15 тысяч рублёў, для навучэнцаў ССНУ — 12 тысяч і для навучэнцаў прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў — 8 тысяч 750 рублёў. Гэта проста смешныя грошы ў параўнанні з платай за арэнду жылля. Магчыма, пэўнай палёгкай для студэнтаў, якія вымушаны самастойна клапаціцца пра пошук жылля, сталі б падатковыя льготы грамадзянам, якія здаюць у арэнду жыллё навучэнскай моладзі — так, як гэта робіцца, напрыклад, у Аўстраліі, якая вельмі зацікаўленая ў прыцягненні замежных студэнтаў. Але пакуль што падатковымі органамі гэта прапанова Міністэрства адукацыі падтрымана не была. Хочацца верыць, што справа ўсё ж такі зрушыцца з мёртвага пункта...

Таццяна Кавалёва паведаміла журналістам, што ў гэтым годзе ў рамках праграмы супрацоўніцтва міністэрствaў адукацыі Беларусі і Расіі расіяне далі магчымасць адабраць 50 беларускіх абітурыентаў, якія не прайшлі ў нас па конкурсе, для іх далейшага навучання ў расійскіх ВНУ на бюджэтнай аснове з выдзяленнем жылля ў студэнцкіх інтэрнатах і выплатай стыпендыі. Прычым размова ішла не толькі пра рэгіянальныя ВНУ, але і пра даволі прэстыжныя спецыяльнасці ў ВНУ расійскай сталіцы і Санкт-Пецярбурга. Якім жа было здзіўленне, калі ахвотных набралася ўсяго 8 чалавек! Абітурыенты і іх сем'і зрабілі выбар на карысць платнага навучання ў беларускіх ВНУ, палічыўшы, што гэта ўсё адно будзе больш танна, чым пражыванне ў Маскве ці ў паўночнай расійскай сталіцы. Па інфармацыі Міністэрства адукацыі, у папярэднім навучальным годзе ў расійскіх вышэйшых навучальных установах атрымлівалі адукацыю каля 4,5 тысячы беларусаў. А ў беларускіх ВНУ навучаліся каля 2,5 тысячы расіян.

Надзея НІКАЛАЕВА.

У «ЖЫРОЎЦЫ» — ЯШЧЭ АДЗІН РАДОК

Страхаванне жылля ўводзіцца ў плацёжку жыхароў. Разлікі — па жаданні.

У сталіцы ўсё больш актыўна ўкараняецца сістэма страхавання жылых памяшканняў. Пакуль добраахвотнага. Разам з тым, як заўважыла ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» кіраўнік цэнтра па суправаджэнні рэформ у жыллёвай гаспадарцы і рабоце з насельніцтвам аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Святлана Сцяпанава, згодна з канцэпцыяй развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі неабходна ў найбліжэйшай перспектыве пераходзіць да абавязковага страхавання.

Страхаванне жылля ў Мінску пачалі ўводзіць з 2007 года. Калі спачатку сталічныя камунальнікі прапаноўвалі жыхарам на разгляд умовы адной страхавой кампаніі, то цяпер — дзвюх. Як справядліва заўважае Святлана Сцяпанава, у людзей павінен быць выбар. Эксперымент па распаўсюджванні страхавання праводзіўся ў двух раёнах — Ленінскім і Фрунзенскім. Але гэта быў хутчэй «лікбез» для насельніцтва. Нядаўна камунальнікі пачалі дзейнічаць больш актыўна: жыхары дамоў, якія абслугоўваюцца арганізацыямі, што ўваходзяць у склад ЖРЭА № 2 Фрунзенскага раёна, атрымалі плацёжкі з новым радком — «страхаванне жылых памяшканняў».

Сума штомесячных выплат — 3375 рублёў. Такія выдаткі, пагадзіцеся, нязначныя для сямейнага бюджэту. Што ж узамен? На момант наступлення страхавога выпадку (калі вас затапілі суседзі зверху) кампанія гарантуе вяртанне страт на суму да 15 мільёнаў рублёў. І вам няма патрэбы хадзіць па судах і шукаць праўды, а пасля «страсаць» з суседзяў грошы на рамонт. Так што прапанова вартая. Паводле слоў Святланы Сцяпанавай, таварыства абароны правоў спажыўцоў ніякіх парушэнняў у дзеяннях сталічных камунальнікаў не адшукала. Паколькі ніхто жыхароў не прымушае зрабіць такі плацеж — усё толькі добраахвотна. Для тых, хто заплаціў, а пасля перадумаў ці ўбачыў, што ўнёс грошы памылкова, прадугледжаны пераразлік.

Пераходзіць да абавязковага страхавання жылых памяшканняў у найбліжэйшыя некалькі гадоў не плануецца. Аднак, заўважыла Святлана Сцяпанава, пэўная колькасць жыхароў ужо ацанілі перавагі такога супрацоўніцтва і заключылі дагаворы са страхавой кампаніяй. У іх «жыроўках» з'явіўся новы радок.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Мінскі бізнэсмен падмануў дзяржпрадпрыемствы на $2 млн

Пра гэта паведамілі ў прэс-службе УУС Мінскай вобласці.

Усяго за 8 месяцаў (з верасня 2007 года па красавік 2008-га) 53-гадовы мінчанін, з'яўляючыся ўласнікам і дырэктарам адразу пяці фірмаў, скалацію прыбытак больш чым у $2 млн. Усе гэтыя грошы па яго, здавалася, бездакорна прадуманай формуле «выпампоўваліся» не адкуль-небудзь, а з дзяржаўных прадпрыемстваў.

Схема абагачэння была настолькі хітрай і заблытанай, што супрацоўнікам падраздзялення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі УУС Мінскай вобласці спатрэбіўся цэлы год, каб разгадаць гэты фінансавы рэбус. Сутнасць яго заключалася ў наступным: махляр рэалізоўваў адразу двум дзяржаўным прадпрыемствам — УП «Белметалплюс» і ААТ «Гроднаоптгандаль» — металапрадукцыю сваіх прадпрыемстваў па завышаных цэнах, пры гэтым у пастаўках сыравіны і пераводзе грашовых сродкаў па яе аплаце ўдзельнічаў цэлы шэраг ілжэпрадпрымальніцкіх структур.

Сёння ў следства ёсць усе падставы меркаваць, што непасрэднае пасобніцтва ў рэалізацыі злачыннай задумы сталічнаму Бендэру аказвалі зацікаўленыя супрацоўнікі абкрадзеных дзяржпрадпрыемстваў, у дачыненні да якіх ужо ўзбуджаны крымінальныя справы з фармулёўкай «злоўжыванне ўладай і службовымі паўнамоцтвамі». Сам жа фігурант праходзіць па артыкуле «Махлярства», што цягне за сабой пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да 10 гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

Кар. БЕЛТА.

Спорт-тайм

БРОНЗАВЫ НАЛЁТ

Беларускі лётчык Дзмітрый Пашчук заваяваў бронзавы медаль на VI чэмпіянаце Еўропы па самалётным спорце, які прайшоў у польскім горадзе Радам. Пашчук выступаў на самалёце Як-55 і атрымаў медаль у адвольным комплексе. Каманда Беларусі, якая складаецца з лётчыкаў Магілёўскага аэраклуба ДАСААФ, упершыню ўдзельнічала ў спаборніцтвах такога высокага ўзроўню. На чэмпіянаце выступілі каманды (па тры лётчыкі) з 17 краін.

КРУГ ДРУГІ

Баскетбалісты зборнай Беларусі пачнуць 2-і круг чэмпіянату Еўропы (дывізіён В) выязной сустрэчай з камандай Румыніі. Гульня адбудзецца сёння, 19 жніўня. Пасля першай паловы турніру падапечныя Аляксандра Папкова набралі 8 ачкоў з 8 магчымых і ўзначальваюць турнірную табліцу. У першым кузе, які адбыўся ў верасні 2008 года, беларускія баскетбалісты перамаглі зборныя Румыніі — 70:59 (дома), Швейцарыі — 81:77 (у гасцях), Албаніі — 92:46 (дома) і Кіпра — 81:80 (у гасцях).

НЕДАЛЁТЫ

Беларускі кідальнік молата Павел Крывіцкі заняў 8-е месца на чэмпіянаце свету па лёгкай атлетыцы ў Берліне. Увечары 17 жніўня ў фінале ён паказаў вынік 76 метраў. Чэмпіёнам стаў Прымож Козмуш са Славеніі з вынікам 80,84.

А ў расійскай камандзе і наогул разыгралася драма — уладальніца шматлікіх рэкордаў, двухразовая алімпійская чэмпіёнка і двухразовая чэмпіёнка свету па скачках з шастом Алена Ісімбаева не рэалізавала ні адной з трох спробаў — яна не змагла ўзяць вышыню 4,75 і двойчы — 4,80 метра. Залаты медаль дастаўся польцы Ганне Рагоўскай, якая адолела 4,75 метра.

Кватэрнае пытанне

Як вярнуць падарунак?

Мы з мужам падарылі дзецям (сыну, нявестцы, унукам) сваю прыватызаваную кватэру. Яны пераехалі, жывуць, але ні за тэхабслугоўванне, ні за камунальныя паслугі плаціць не хочуць. Ці можам мы «забраць» свой падарунак назад?

В. К., Мінскі раён.

Пасля дарэння кватэры альбо часткі яе былы ўладальнік страчвае права ўласнасці. Новы ж уладальнік мае права не толькі карыстацца гэтым жылым памяшканнем, але і распараджацца ім паводле свайго меркавання ў поўным аб'ёме (г. зн. прадаваць, мяняць, дарыць і ажыццяўляць іншыя здзелкі ў вызначаным заканадаўствам парадку).

Грамадзянскае заканадаўства дапускае магчымасць вяртання падоранай маёмасці ў шэрагу выпадкаў. Напрыклад, калі здзелка па дагаворы дарэння прызнаная судом несапраўднай (арт. 167, 168 ГК) у сувязі з тым, што яна ажыццёўлена пад уплывам памылковага погляду (арт. 179 ГК), калі яна ажыццёўлена грамадзянінам, які не здольны разумець значэння сваіх дзеянняў і кіраваць імі (арт. 177 ГК), або пад уплывам падману, гвалту, пагрозы і інш. (арт. 180 ГК).

Пры гэтым неабходна мець на ўвазе, што іск аб устанаўленні факта нязначнасці здзелкі і аб прымяненні наступстваў яе несапраўднасці можа быць прад'яўлены на працягу дзесяці гадоў з дня, калі пачалося яго выкананне.

Віктар САВІЦКІ.

Сярэдняя зарплата за чэрвень павысілася на 3,6 працэнта

Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў Беларусі ў студзені—чэрвені гэтага года склала Br957,2 тыс., паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце. У чэрвені сярэдняя зарплата была Br1 млн 14,8 тыс. — на 3,6 працэнта (на Br35,6 тыс.) больш у параўнанні з маем 2009 года.

Паводле аператыўных даных статыстычнага ведамства, рэальная налічаная заработная плата (разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэнаў на тавары і паслугі) у чэрвені гэтага года ўзрасла на 0,1 працэнта да чэрвеня 2008 года, а ў параўнанні з маем гэтага года гэты паказчык павялічыўся на 3,2 працэнта.

Сярэдняя пенсія ўсіх відаў складае ў жніўні Br392,6 тыс.

Пра гэта паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Сярэднямесячная пенсія ў студзені—жніўні гэтага года складае Br390,8 тыс. — на 11,3 працэнта больш, чым у студзені—жніўні мінулага года. Памер сярэдняй працоўнай пенсіі ў жніўні гэтага года складае Br397 тыс. Сярэдняя пенсія па ўзросце — Br410 тыс., мінімальная па ўзросце (з улікам даплаты да яе) — Br236 тыс., сярэдняя пенсія па інваліднасці — Br363,3 тыс. (без уліку пенсій з-за працоўнага калецтва і прафзахворвання), па прычыне страты карміцеля — Br243,7 тыс., за выслугу гадоў — Br536,1 тыс., за асаблівыя заслугі перад рэспублікай — Br611,2 тыс.

Што датычыцца разліковых паказчыкаў, то ў жніўні максімальная пенсія па ўзросце (пры стажы 40 гадоў у жанчын і 45 гадоў у мужчын і індывідуальным каэфіцыенце заработку 1,3 і вышэй) для працуючых пенсіянераў складае Br460 тыс. 390, для непрацуючых пенсіянераў (пры стажы 40 гадоў у жанчын і 45 гадоў у мужчын і індывідуальным каэфіцыенце заработку 4,0 і вышэй) — Br634 тыс. 240. Максімальная пенсія па ўзросце для непрацуючых пенсіянераў з ліку былых шахцёраў пры стажы падземнай работы не менш як 10 гадоў у мужчын і 7,5 года ў жанчын — Br808 тыс. 90, пры стажы работы на асобных відах падземных і адкрытых горных работ не менш як 25 гадоў у мужчын і 20 гадоў у жанчын — Br981 тыс. 940.

Мінімальная пенсія па ўзросце складае Br62 тыс. 353 (гэты нарматыў прымяняецца пры вылічэнні сацыяльных пенсій, надбавак і павышэнняў да пенсій, ён роўны 25 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва).

Рэальны памер пенсіі за ліпень знізіўся на 0,4 працэнта

Сярэдні памер пенсіі, назначанай органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, у ліпені гэтага года склаў у Беларусі Br391 тыс., паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Паводле слоў спецыялістаў, гэта складае 116,7 працэнта велічыні сярэднедушавога мінімальнага спажывецкага бюджэту сям'і пенсіянераў (у адпаведнасці з пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, у перыяд з 1 мая па 31 ліпеня 2009 года гэты сацыяльны нарматыў у разліку на месяц складае Br335,1 тыс.).

Сярэдні памер пенсіі па ўзросце ў ліпені гэтага года быў Br409,3 тыс., па інваліднасці — Br361,4 тыс., па прычыне страты карміцеля — Br244,4 тыс., памер сацыяльнай пенсіі склаў Br182 тыс.

Рэальны памер назначанай месячнай пенсіі (скарэкціраванай на індэкс спажывецкіх цэнаў на тавары і паслугі) у ліпені гэтага года ў параўнанні з ліпенем 2008-га зменшыўся на 0,8 працэнта, у параўнанні з чэрвенем 2009-га — на 0,4 працэнта.

Абзац

Дзяржаўная ветслужба Мінсельгасхарчу Беларусі па выніках праверкі да раней выключаных са спісу экспарцёраў прадукцыі ў Расію Дзятлаўскага сыраробнага завода і Скідзельскага масласырзавода дадала Бабруйскі мясакамбінат, Лунінецкі малочны камбінат, Кобрынскі масласырзавод і КУП «Гармалзавод №1» Мінска. Прычынай стала выяўленне ў прадукцыі слядоў антыбіётыкаў тэтрацыклінавай групы.

У Адзесе валанцёры пачалі мыць Пацёмкінскую лесвіцу. Валанцёры, у лік якіх уваходзяць супрацоўнікі нямецкай кампаніі па вытворчасці чысцячых сродкаў, маюць намер адмыць усе 10 пралётаў лесвіцы, што складаецца са 192 прыступак. Спачатку плануецца адмыць правую, а затым левую палову лесвіцы. У прамежку паміж двума этапамі ўборкі гараджане змогуць убачыць розніцу паміж чыстым і брудным бакамі помніка. Падчас працы будзе зняты дакументальны фільм. Да ўдзелу ва ўборцы запрашаюцца ўсе ахвотныя. Добраахвотніцкі рух, які займаецца мыццём помнікаў архітэктуры, існуе ўжо 25 гадоў. За гэты час удзельнікі руху паспелі адмыць, у прыватнасці, Брандэнбургскія вароты ў Берліне, статую Хрыста ў Рыа-дэ-Жанейра, каланаду плошчы Святога Пятра ў Рыме, Калосаў Мемнона ў Луксоры і галовы прэзідэнтаў на гары Рашмор у ЗША.

Кітай завяршыў клінічныя выпрабаванні вакцыны ад грыпу A/H1N1. Папярэднія вынікі сведчаць аб дзейснасці новага прэпарата. Клінічныя тэсты пачаліся 22 ліпеня і завяршыліся 15 жніўня. У іх прынялі ўдзел 1614 добраахвотнікаў ва ўзросце ад трох гадоў. Ва ўсіх пацыентаў з'явілася імунная рэакцыя, а ў іх крыві былі выяўленыя антыцелы, здольныя супрацьстаяць вірусу новага грыпу. Прэпарат распрацаваны карпарацыяй SINOVAC. Гэтая вакцына супраць грыпу A/H1N1 стала першай у свеце, якая прайшла клінічныя выпрабаванні. Мяркуецца, што ў верасні вакцына паступіць у бальніцы.

Ва Украіне, у Жытомірскай вобл., двое дзяцей, 2002 і 2004 гадоў нараджэння, задыхнуліся, зачыніўшыся ў халадзільніку. Інцыдэнт адбыўся 17 жніўня ў в. Шэршні Карасцянскага раёна. Гуляючы ў дварэ, яны зачыніліся ў старым халадзільніку і не змаглі адтуль выбрацца. Калі бацькі адчынілі халадзільнік, які стаяў у хляве, хлопчык і дзяўчынка ўжо былі мёртвыя, яны задыхнуліся ад недахопу кісларoду.

Поўны абзац

90 % банкнот, якімі карыстаюцца жыхары ЗША, маюць на сабе сляды какаіну. Да такой высновы прыйшлі навукоўцы з Масачусецкага ўніверсітэта, якія правялі даследаванне на прадмет наяўнасці часцінак наркотыкаў на нацыянальнай валюце ЗША, Канады, Бразіліі, Японіі і Кітая. Часцей за ўсё грошы са слядамі какаіну трапляюцца ў Вашынгтоне: у сталіцы ЗША такіх банкнот пераважная большасць — да 95 %. Прыкладна такія ж паказчыкі зарэгістраваныя і ў іншых буйных гарадах. Самымі «чыстымі» былі банкноты з Кітая — колькасць папяровых грошай са слядамі какаіну не перавышае 20 %. Таксама нізкі паказчык быў зафіксаваны ў Японіі (12 %).

Губернатар Пермскага краю Алег Чыркуноў гатовы з асабістых сродкаў кампенсаваць аўтамабілістам выдаткі, якія яны панеслі, даўшы хабар інспектару ДІНДР. Умовай падобнага пакрыцця з'яўляецца падрабязнае паведамленне аб дакладнай суме хабару, часу, месцы, дзе гэта адбылося, а таксама назначэнне нумара патрульнага аўтамабіля і асабістага нумара даішніка. Па словах Чыркунова, ён прапаноўвае кампенсацыю толькі жыхарам Пермскага краю і толькі ў выпадку, калі максімальная сума выплаты не будзе перавышаць 20 тысяч рублёў. Чыноўнік назваў кампенсацыю хабару даішнікам «асабістым укладам у змаганне з карупцыяй» у рэгіёне. У адпаведнасці з Крымінальным кодэксам РФ, чалавек вызваляецца ад крымінальнай адказнасці за дачу хабару службовай асобе ў тым выпадку, калі добраахвотна паведаміць аб гэтым органу, які мае права ўзбудзіць крымінальную справу.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ИЗВЕЩЕНИЕ

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «ЗЕНИТ – БЕЛОМО»
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже следующих зданий: **Лот № 1:** здание специализированное розничной торговли (пристройка к дому), об. пл. 1576,5 кв.м, *г. Вилейка, ул. Чапаева, 60.* Начальная цена с НДС – 758 678 830 бел. руб. Задаток – 35 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,1007 га. **Лот № 2:** здания специализированные складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ – здание склада ЛВЖ, об. пл. 684,9 кв.м, здание кислотного склада, об. пл. 196,5 кв.м, *г Вилейка, ул. Красина.* Начальная цена с НДС – 1 692 287 637 бел. руб. Задаток – 50 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,4619 га, имеется ж/д ветка; **Лот № 3:** здание специализированное для производства электротехнического, электронного и оптического оборудования (производственный корпус № 7 с АБК), об. пл. 19605,9 кв.м, *г. Вилейка, ул. Чапаева, 26.* Начальная цена с НДС – 11 043 535 335 бел. руб. Задаток – 100 000 000 бел. руб. Земельный участок для обслуживания данного здания будет выделен из земельного участка об. пл. 10,3339 га находящегося в постоянном пользовании ОАО «Зенит – БелОМО». **Лот № 4:** кафе мороженное, об.пл. 162,4 кв.м (изолированное нежилое помещение), *г. Вилейка, ул. Гагарина, 12.* Площадь земельного участка – 0,0345 га. Начальная цена с НДС – 174 140 941 бел. руб. Задаток – 10 000 000 бел. руб. Задаток перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 20 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в следующем порядке: 50 % стоимости объекта оплачивается в течение 30 дней с даты подписания договора купли-продажи, оставшиеся 50 % в течение шести месяцев с даты первой оплаты. Возможна корректировка сроков оплаты по соглашению сторон до подписания договора купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **22.09.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.09.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел. (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.

Минский городской центр недвижимости

ОАО «БЕЛТРАНСГАЗ» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО
С УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
(ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

ПОВТОРНО ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже водоотливной установки УВТ-500 на базе трактора ДТ-75 (инв. № 3511).

Начальная цена – 19 132 000 белорусских рублей без учета НДС.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о государственной регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка в размере 1 900 000 белорусских рублей, иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона заключается в течение 5 рабочих дней с даты проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 5 рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи. Аукцион состоится **27 августа 2009 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукцион

Ёсць меркаванне

«Настаўнікаў трэба вызваліць ад залішняй апекі»

Падставай да напісання гэтага артыкула стала гутарка работнікаў раённага аддзела адукацыі, якую я пачуў выпадкова ў аўтобусе. Дзве супрацоўніцы ехалі з праверкі і разважалі пра карысць кантролю за школьнымі настаўнікамі, маўляў, каб тыя не расслаблялiся, а ведалі сваё месца перад кіраўніцтвам... Абедзве абуралiся тым, што нейкая пенсіянерка паспрабавала аспрэчыць іх указанні. Іх вердыкт: завучаў-пенсіянерку — у адстаўку...

А цяпер аб тым, на якія роздумы аб ходзе школьнай рэформы падштурхнула мяне выпадкова пачутая ў аўтобусе гутарка. Пасля палёту Ю. Гагарына ў космас у 1961 годзе амерыканцы сталі аналізаваць, чаму Савецкі Саюз дабіўся такіх поспехаў, і вызначылі, што рускія здолелі іх абагнаць, дзякуючы сваёй сістэме адукацыі. Гэта значыць, што ўзровень і якасць савецкай сярэдняй і вышэйшай школы былі на галаву вышэйшыя за амерыканскую. Калі казаць аб'ектыўна, то сярэдняя школа дасталася нам без змяненняў з 1917 года. Бальшавікі не толькі не зламалі класічную царскую гімназію, але і ўзялі яе за аснову сваёй сістэмы адукацыі, што дазволіла Савецкаму Саюзу за кароткі тэрмін вырашыць грандыёзныя задачы ў прамысловасці і навуцы. Дык чаму цяпер у нас планамерна ўкараняюць амерыканскую сістэму і чужыя методыкі: навязваюць тэсціраванне, знімаюць класічныя экзамены па прадметах у школе і ВНУ?! А навошта сярэднюю школу падзялілі на прывілеяваную і ніжэйшую? Я маю на ўвазе гімназіі, ліцэі і звычайныя сярэднія школы. Паўсюдна мы назіраем наступную карціну: са школ у гімназіі і ліцэі забіраюць лепшых вучняў, пакідаючы тых без лідараў. Вучні такіх школ, у параўнанні з вучнямі элітных гімназій, выглядаюць непаўнавартаснымі,ды і настаўнікі такіх школ адчуваюць сябе не лепш... Дык ці патрэбныя элітныя сярэднія навучальныя ўстановы ў Беларусі? Так! Але іх павінна быць няшмат — 5—7 на ўсю краіну, яны павінны дзейнічаць пры нашых вядучых ВНУ, і вучыцца там павінны найбольш адораныя дзеці. Я ўжо агучваў раней на старонках «Звязды» прапанову аб перайменаванні ўсіх сярэдніх школ у гімназіі, каб ліквідаваць тым самым падзел сярэдняй школы на элітарнасць. Тады па ўсёй краіне ўсе дзеці будуць гімназістамі, і вучыць іх будуць па адзіных праграмах і методыках. Выкладчыкі з ліцэяў і гімназій могуць мне запярэчыць, але я лічу, што вучэбныя праграмы і методыкі гэтых установ накіраваны на «вузкую» частку вучняў, бо акцэнт там робіцца на вывучэнне трох-чатырох прадметаў. «Казыраюць» затым працэнтамі паступлення выпускнікоў у ВНУ, а разам з тым агульнаадукацыйны ўзровень такога вучня застаецца вельмі нізкім. Гэта не яго бяда, а праблема сістэмы выкладання і так званай «школьнай рэформы». Настаўніку проста не даюць вучыць дзяцей...

Да рэвалюцыі настаўніку гімназіі даплачвалі 25 рублёў на наём кухаркі-хатняй гаспадыні, каб той меў магчымасць падрыхтавацца да ўрокаў, праверыць кантрольныя і г.д. Цяпер жа настаўнік і не чытае, і не рыхтуецца да ўрокаў, а сядзіць да паловы ночы і піша адказы на інструкцыі з гарадскога ці раённага аддзела адукацыі. У савецкія часы ў гар-райана ў малых і сярэдніх гарадах з насельніцтвам ад 50 да 100 тысяч чалавек працавала 7—8 спецыялістаў. І спраўляліся, кантралявалі, а, самае галоўнае, не перашкаджалі настаўніку... Цяпер іх ужо 70—80 чалавек! Навошта патрэбна столькі «рэтранслятараў» ад адукацыі? Раней у аддзел адукацыі бралі спецыяліста, які 10—15 гадоў адпрацаваў прадметнікам ці завучам у сярэдняй школе і мог нечаму навучыць школьнага настаўніка пры праверцы. Цяпер жа — гэта зарослы бюракратычны орган, які перашкаджае настаўніку і адцягвае яго ўвагу сваімі шматлікімі інструкцыямі і праверкамі. Я лічу, што трэба вызваліць настаўніка ад залішняй «апекі», даць яму час на вучняў, на самападрыхтоўку, чытанне літаратуры і г.д., у рэшце рэшт, і на адпачынак. А выйграюць ад гэтага нашы дзеці.

Хацелася б узняць яшчэ адно прынцыповае пытанне — абавязкова трэба вярнуць у школы настаўнікаў-мужчын. Гэта, на мой погляд, задача дзяржаўнай важнасці. З іх прыходам у школе з'явіцца дысцыпліна, палепшыцца якасць ведаў вучняў, і, што вельмі важна, павысіцца прэстыж прафесіі настаўніка. На ток-шоу «Выбар», прысвечаным тэсціраванню, ацэньвалася работа сельскіх настаўнікаў і іх вучняў. Скажу адразу, што вясковы настаўнік выконвае сваю працу лепш, чым яго гарадскі калега. Гарадскі настаўнік замест прафесійнага выканання сваіх абавязкаў падаўся ў рэпетытары, асабліва гэта кідаецца ў вочы ў абласных цэнтрах і ў сталіцы. Усё зразумела, зарабляе грошы. Але чым настаўнік адрозніваецца ад рэпетытара: першы — вучыць, а другі — нацягвае, а гэта не адно і тое ж. Вось чаму вясковыя юнакі і дзяўчаты пачынаюць абыходзіць па якасці ведаў гарадскіх. Ды і кантралёраў у вясковыя школы прыязджае значна менш...

І апошняе, пра што хацелася б сказаць. Савецкія падручнікі для сярэдняй школы па матэматыцы, фізіцы, астраноміі, хіміі, літаратуры, геаграфіі і г.д. былі лепшымі сярод аналагічных падручнікаў у іншых краінах. Нездарма па гэтых падручніках (з перакладам іх на іспанскую мову) вучацца цяпер дзеці Лацінскай Амерыкі. У нас жа якасныя падручнікі мэтанакіравана замяняюцца «сурагатамі ад навукі». Спадары распрацоўшчыкі падручнікаў, калі вы не можаце напісаць якаснае новае, то вярніцеся да праверaных падручнікаў, якія былі напісаны простай і зразумелай для дзіцяці мовай.

Уладзімір КСЁНЗ, *г. Ліда*.



Паедзе — не паедзе...

Паводле слоў дзядулі, у нас, на Арэнбуржчыне, вялікая радня. Мы доўга збіраліся яе наведаць і гэтым летам такі рашыліся.

На чыгуначным вакзале нас сустрэлі стрыечныя маміны браты, усе разам мы паехалі ў вёску, да бабулі Зіны, роднай дзядулевай сястры, а потым... Дзядуля праўду казаў: за чатырнаццаць гадоў свайго жыцця радні я бачыў меней, чым за адзін тыдзень на Арэнбуржчыне! Траюрадныя брацікі і сястрычкі, дзядзькі і цёткі, бабулі, дзядулі... Усе прыемныя, добрыя людзі!

Але ж пра аднаго сваяка вось гэтага, мусіць, не скажаш. Не, ён неблагі. І ў дзяцінстве, пасля вайны, вельмі шмат што перажыў... Але ж, як я зразумеў, усё жыццё дзядзька Юрась быў, мякка кажучы, не раўнадушны да алкаголю, з-за чаго і здаралася з ім вельмі многа смешных і (не вельмі) гісторый. Адну з іх я і хачу расказаць.

Значыць, доўгі час наш дзядзька Юрась працаваў вадзіцелем, потым перасеў на трактар. У саўгасе такіх спецыялістаў, як ён, было не вельмі шмат. А вось аматараў выпіць — больш, чым дастаткова.

Дык вось аднойчы (заўважым — падчас працоўнага дня) яны, гэтыя аматары, з'ехаліся разам і рашылі, як кажуць, зрабіць па чарцы, непадалёк, на роўнай дарозе, паставілі тэхніку. Дзядзька ж Юрась вызначыўся — ён на сваім жалезным кані заехаў на вяршыню досыць крутога пагорка і заглушыў рухавік там. У калег, магчыма, было адчуванне, што трактар можа «сарвацца» і паімчаць па нахіленай, але ж каму да гэтага справа, калі «накрыта паляна», калі наліта па першай, а потым і па другой...

Пасля трэцяй аднаму з мужыкоў падалося, што самотны трактар, як быццам, уздрыгнуў, зварухнуўся? Ён нават на горку пальцам паказаў:

— Юра, паглядзі!

Дзядзька на гэта (ды спакойна так):

— Бачу... Але будзь спакойны — трактар не паедзе.

І той сапраўды стаяў!.. Потым зварухнуўся яшчэ раз.

— Не, не паедзе, — яшчэ раз запэўніў дзядзька.

Але на гэты раз паслухмяны «Беларус» яго не паслухаў — каменем ляцеў уніз. Дзядзька, яшчэ не верачы сваім вачам, падхапіўся з месца, кінуўся да яго, але што ён там мог зрабіць?..

Самае цікавае, што пад гэтай гарой раскінулася невялікае сяло, і найпершым будынкам «на шляху «Беларуса» быў... адміністрацыйны, дзе размяшчалася кіраўніцтва саўгаса, сельскі Савет, кабінет участковага...

Грукат пры сутыкненні быў проста жудасны!

Праз колькі секундаў, калі пыл хоць трохі асеў, стала бачна, што досыць доўгая пабудова... «рассечаная» на дзве. Ахвяраў няма, адно — дзядзька Юрась, які першым прыбег да месца здарэння, старанна падымае з зямлі і абтрасае бруд з касцюма дырэктара саўгаса, напрамілы бог просіць прабачыць!

Але ж, відаць, марна (прасіў) — яму не даравалі, бо ў гэтай гаспадарцы дзядзька больш не працаваў.

Павел Балышаў,

г. Мінск

Відаць па вачах, хто ходзіць па начах

...Гэты сад заклалі на пачатку 50-х, так што на пачатку 60-х калгас ужо меў істотны прыбытак ад продажу яблыкаў. А яшчэ...

У тым садзе, апроч яблынь, была пасаджана ладная колькасць чарэшань. Гэта цяпер імі нікога не здзівіш, а тады, калі ні бананаў, ні апельсінаў, ні ківі ніхто і ў вочы не бачыў, гэтыя дрэўцы сталі сапраўднай з'явай. Уся вёска з цікавасцю сачыла спярша, ці добра ж яны цвітуць, ці лётаюць над кветкамі пчолы, ці дружна завязваюцца ягады, потым — без перабольшвання — пачыналі чакаць, калі яны пажаўцеюць-паспеюць, калі прыйдзе час збіраць ураджай. І тады...

Мала таго, што тады добра было зарабіць працадзень — можна ж ад пуза наесціся, прычым самымі спелымі, больш за тое — узяць з сабой: кожнаму «зборшчыку» ў якасці прэміі давалі па дзве кілі чарэшань. Дома ўсё прынесенае, як правіла, дзялілася папалам (каб і на раніцу было!), а потым рассыпалася па місачках — па колькасці едакоў. Сем'і былі не раўня цяперашнім... Таму кожнаму даставалася пакрысе — толькі паласавацца. І людзі дарослыя з гэтым мірыліся, а вось дзятва — не. Ёй у той сад трэба было залезці — канча!

А між тым гэта было вельмі рызыкоўна, бо, з аднаго боку, строга забаранялася бацькамі, а з іншага — сад пільна ахоўваўся. Асабліва — па вечарах і ноччу. І дзяжурыў там дзед Ісак — з сабакам. У іх там нават будка спецыяльная была — для начлегу.

Дык вось. Неяк аднойчы і нягледзячы ні на што, спланавалі хлопцы «аперацыю», сышліся разам, доўга і моўчкі сядзелі за плотам — «пасвілі» вартаўніка, чакалі, пакуль ён разам з тым сабакам у будцы схаваюцца...

І прычакалі ж такі! Зайшлі. Яны. А дзятва тады саранчой цераз плот... Толькі б на дрэўцы і да той смакаты, — а не... Ад будкі «гаў-гаў-гаў-гаў!». Дзеці — у рассыпную. І ходу! Беглі, — што мелі сілаў!

І вось адзін, змогшыся ўжо, улятае ў хату, — маці насустрач:

— Сынок, а дзе ж ты быў?! Што так запыхаўся?

— На вуліцы, — адказвае той, ледзь пераводзячы дух. — З хлопцамі... Дурэлі... Бегалі...

— І хто ж апошнім бег?

— Ісакаў сабачка.

Вось так разумныя добрыя мамы выводзілі нашы дзіцячыя сакрэты.

А што да саду, то чарэшні і частка яблынь ужо выкарчаваныя, будку Ісакаву ці не тыя ж хлопцы (толькі ўжо дарослыя) па п'янцы спалілі. А гісторыя вось засталася.

С.Б., *Рагачоўскі раён*

Рыбацкае шчасце

Праз нашу вёску ідзе дарога і над канавай — робіць паварот: перад мостам вока ды вока патрэбна, бо варта хоць крыху зазявацца і ўсё — загрыміш.

Па першасці туды многія падалі, асобныя — нават не раз. А вось дзядзьку Хведара Бог, як кажуць, абносіў. Чым ён вельмі ганарыўся! Але ж — да пары.

Аднаго вечара завітаў ён да нас — «на светлячок». Пасядзелі, пагаманілі, пасмяяліся, бо там дзе дзядзька без гэтага ну ніяк... Гумарыст ён. Але і пра сур'ёзныя рэчы ў той раз гаварыў. Яму, маўляў, рыбіну прывезлі, у горадзе па вялікім блаце купілі. Шабляй называецца — з метр даўжынёй, пальцы на чатыры — таўшчынёй...

Ніхто ў нас гэткай рыбы дагэтуль не бачыў, нават назвы не чуў! Рашылі, што залівае мужык — не паверылі. Ён у крыўду. Кажа, раз вы так, то я зараз пайду дамоў і прынясу яе.

Ляпнуў дзвярыма, пайшоў. І... з канцамі. Значыць, рыбіны той і праўда не было, падумалі мужыкі. Дзядзька ж між тым, паспяхова праскочыўшы мост, прытупаў дадому, ухапіў рыбіну (а заадно і на бутэльку ў кладоўцы пашчасціла) і «ў прадчуванні» падаўся да нас. А цемра навокал — як кажуць, на ваўка можна сесці і не заўважыць! Спыніўся дзядзька. Азірнуўся. Стаў шукаць хоць нейкі арыенцір: добра б слупок на месце. Некалі іх шэсць было... Пяць палеглі ў няроўнай схватцы з трактарамі і машынамі. Але ж адзін застаўся.

Дзядзька знайшоў яго, беленькі, крыху пахілены, нават абмацаў.

— А зараз — пайду, — рашыў ён і ўпэўнена ступіў...

Думаў — на мост, а высветліася — на выліты з бетону «жолаб» для сцёку вады... І ў тую канаву... Як тарпеда... З галавой! Пырскі аж над мостам ляцелі, крык — над усёй ваколіцай! Але дзядзькава жонка, прыбегшы, кінулася спачатку шапку «ратаваць», пакуль цячэннем не знесла...

А гэтым жа часам з гасцей ішла другая кабета і таксама на крык.

— Федзя?! А што ты тут робіш? — спытала яна.

— А то не бачыш! — гаркнуў дзядзька. — Рыбу лаўлю! Трымай во!

І кідэц ёй... тую шаблю з кладоўкі.

— Ой, Федзечка, упоцемках ловіш?! Ды такую вялікую!.. Гэта, можа, уюн?

— Шчыпоўка, — кінуў ёй дзядзька (пачуццё гумару не пакідала яго нават тут).

Пакуль кабета думала, ці можа шчыпоўка (самая дробная рыбка сямейства ўюновых) вось гэткай вырасці, ля канавы з'явілася-такі дзядзькава жонка з шапкай. Удваіх яны неяк выцягнулі небараку з ледзянога палону, завялі дамоў.

А назаўтра ён ужо быў у нас — з тою самай рыбінай. І расказам пра тое, як злавіў яе — упоцемках.

Анатоль Галушка,

в. Магільнае, Івацэвіцкі раён

Ёсць такая культура!

У 1956 годзе ў Беларусі адбывалася ўзбуйненне абласцей. Не стала, прынамсі, нашай Баранавіцкай... Частка змелъ, як робіцца ў гэтым выпадку, адышла пад Брэсцкую, частка — пад Гродзенскую.

З імі, з землямі, напэўна, прасцей было. Складаней — з кадрамі, бо ў выніку ўзбуйнення вызвалілася досыць шмат чыноўнікаў, якія ўмелі хіба што кіраваць. А чым? І кім?

Каб знайсці для іх нейкія пасады, аб'явілі чарговы партыйны прызыў — як у Шолахава ў «Паднятай цаліне». Толькі ў нас добраахвотнікаў меней было...

Дык вось. Адзін з іх — былы палітрук партызанскай брыгады — пагадзіўся пераехаць у нашу вёску, узначаліць калгас «Уперад».

Ён — пагадзіўся, але ж трэба было спытацца і ў нас.

Прызначылі агульны сход, з'явілася высокае начальства, з гадзіну даводзіла, што старшыню нам трэба мяняць. І людзі ўважліва слухалі, маўчалі, як быццам, згаджаліся. А прыйшла чарга галасаваць, — большасць супраць!..

Першы раз нічога не атрымалася, другі... Потым партыйнае начальства ў абход пайшло — «старому» старшыні прапанавалі звольніцца з-за дрэннага здароўя. І новага ж такі зацвердзілі!

Прыняў ён гаспадарку, паехаў аглядаць палеткі. Што ён там бачыў — гісторыя замоўчвае. Факт, што ў брыгадзе Жукоўскага згледзеў цэлае поле... свірэпы. Ды гэтакай жа гусценькай, жоўценькай... У старшыні аж вочы засвяціліся — ад радасці. Пытаецца ў брыгадзіра:

— Што гэта цвіце?

— А-а, лухта, — адказвае той.

Праехалі потым між астатніх палёў, але ж характэра вось такога нідзе больш не ўбачылі!

Вечарам новы старшыня сабраў праўленне — падваліў брыгадзірам! І, як кажуць, па першае чысло. За што? Хочаце верце, хочаце — не, за тое, што... не пасеялі той лухты, што расце ў Жукоўскага.

У. Лабко,

в. Дзераўная, Слонімскі раён

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже объекта республиканской собственности

Предмет аукциона	Лот № 1
	Изолированное помещение инв. № 440/D-3203
Место нахождения объектов	Ошмянский район, дер. Гольшаны, ул. Трабская, 10
Начальная цена предмета аукциона, тыс. рублей	27 418,356
Сумма задатка, тыс. рублей	2 741,000
Продавец недвижимого имущества (наименование, тел.)	Гродненское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», контактные телефоны: 8 (0152) 74 43 96, 74 43 92
Характеристика объектов недвижимого имущества	**Изолированное нежилое помещение аптеки** 1880 года постройки, площадью 99,4 кв. м, фундамент бутобетонный, наружные и внутренние стены кирпичные, перегородки кирпичные, перекрытия деревянные, кровля – асбестоцементные листы по деревянным стропилам, полы дощатые, имеется электроснабжение, печное отопление, сеть телефонизации; **сарай** – одноэтажное здание 1910 года постройки, общая площадь 48 кв. м, фундамент бутобетонный, стены бревенчатые, крыша двускатная из асбестоцементных листов. Помещения площадью 62,33 кв. м обременены договорами аренды на срок до 01.10.2009 г.
Условия продажи недвижимого имущества	Вовлечение в хозяйственный оборот в течение одного года с момента приобретения, благоустройство объекта и прилегающей территории
Организатор аукциона (наименование, адрес, тел.)	Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул.17 Сентября, 39, тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней)

1. Аукцион состоится **21 сентября 2009 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Аукцион является открытым, участниками торгов могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются Организатором аукциона по **16 сентября 2009 года до 16.00**, по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, **кабинет 6.**

К заявлению прилагаются следующие документы:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 500044549;

- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов;

- юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором торгов;

- иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводам на русский или белорусский язык;

- представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

- представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Руководителю юридического лица просьба иметь документ, подтверждающий его полномочия.

4. Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

5. Организатор аукциона имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

6. Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случаях, если:

- заявление на участие в торгах по конкретному предмету торгов подано менее чем двумя участниками;

- перед началом торгов у организатора торгов зарегистрированы и обменяли билеты участников торгов на аукционные номера менее чем два участника.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, комиссия оформляет протокол о возможности продажи этому участнику предмета аукциона при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, и при условии, что данный участник (далее – претендент на покупку) обязуется выполнить условия аукциона.

7. Торги по конкретному предмету торгов признаются нерезультативными в случаях, если:

- ни один из участников торгов в соответствии с решением комиссии не был признан победителем;

- ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер (при проведении аукциона).

8. Не допускается начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене. После объявления очередной цены аукционист называет номер участника аукциона, который первым поднял аукционный номер, и указывает на этого участника аукциона. Затем аукционист в соответствии с шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет проданным предмет аукциона словом «продано», а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему предмету аукциона.

9. Возмещение затрат на организацию и проведение результативных торгов осуществляется победителем торгов (претендентом на покупку) по фактическим затратам. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан перечислить в республиканский бюджет указанную сумму фактических затрат в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

10. После предъявления копии платежных документов о перечислении затрат на организацию и проведение торгов в установленном порядке в соответствии с условиями торгов между продавцом и победителем торгов (претендентом на покупку) в течение 2-х рабочих дней заключается договор купли-продажи предмета торгов.

11. Оплата стоимости приобретенного предмета аукциона осуществляется в установленном законодательством порядке: победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся резидентом Республики Беларусь, в рублях; победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся нерезидентом Республики Беларусь, в рублях либо в иностранной валюте по курсу Национального банка на дату платежа. Срок оплаты недвижимого имущества – в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

12. В случае невыполнения условий продажи объекта приобретателем имущества, договор купли-продажи расторгается в одностороннем порядке без компенсации затрат.

г. ВИТЕБСК 10 сентября 2009 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

№ Лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1	Здание бывшего пункта централизованного наблюдения, расположенное по адресу: Витебская область, Миорский район, г. Дисна, ул. Советская, д. 10, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инв. № 211/С-8654 (здание неустановленного назначения – пункт централизованного наблюдения), одноэтажное, кирпичное, 1987 г. постройки, общая площадь 36,7 кв.м, объем 152 куб.м, фундамент б/бетонный, перекрытие ж/бетонное, крыша а/волнистая. Земельный участок: с кадастровым номером 223351000001000037, площадь 0,0133 га для размещения административного здания, срок аренды 50 лет.	11 777 687	1 177 768
2	Административное помещение, расположенное по адресу: Витебская область, Браславский район, г. Браслав, ул. Советская, 4, помещение 2, и здание специализированное автомобильного транспорта, расположенное по адресу: Витебская область, Браславский район, г. Браслав, ул. Советская, 4, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объектов недвижимости: – изолированное помещение с инвентарным номером 210/D-2038, общая площадь 118,3 кв.м, объем 470 куб.м, стены бревенчатые, перекрытие деревянное, крыша а/волнистая; – капитальное строение с инвентарным номером 210/С-11692 (одноэтажное п/блочное), общая площадь 33,9 кв.м, объем 94 куб.м, фундамент бутобетонный, перекрытие деревянное, крыша а/волнистая. Земельный участок: с кадастровым номером 220850100002000024, площадь 0,0232 га для обслуживания недвижимого имущества, срок аренды 40 лет. Использование – для размещения административно-производственного объекта.	48 348 927	4 834 892
3	Неиспользуемые капитальные строения: здание административно-хозяйственное с колодцем и асфальтобетонным покрытием и сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, расположенные по адресу: Витебская область, Бешенковичский район, г.п. Бешенковичи, ул. Володарского, 49, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объектов недвижимости: – капитальное строение с инвентарным номером 231/С-8416 – одноэтажное бревенчатое здание, фундамент бутовый, перекрытия деревянные утепленные, крыша шиферная, общая площадь 128,9 кв.м, 1988 г. постройки; пристройка кирпичная; холодная пристройка кирпичная; колодец, ж/б кольца; дворовое покрытие – асфальт, общая площадь 776 кв.м; – капитальное строение с инвентарным номером 231/С-8415 – одноэтажное кирпичное здание, фундамент бутовый, перекрытия железобетонные, крыша шиферная, общая площадь 75,4 кв.м, 1988 г. постройки. Земельный участок: с кадастровым номером 220555100001001826, площадь 0,1468 га для обслуживания административного здания и построек, срок аренды 55 лет. Ограничения в использовании земельного участка – охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 В, площадью 0,0230 га, охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В, площадью 0,0096 га.	64 934 703	6 493 470

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. Правды, 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail:votfondgi@tut.by.

ПРОДАВЕЦ: Департамент охраны Министерства внутренних дел Республики Беларусь, контактный телефон в г. Витебске (0212) 48 76 87.

АРЕНДОДАТЕЛЬ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА: **Лота № 1** – Миорский районный исполнительный комитет; **Лота № 2** – Браславский районный исполнительный комитет; **Лота № 3** – Бешенковичский районный исполнительный комитет.

Условия продажи единого предмета аукциона:

Лот № 1: заключение победителем аукциона с райисполкомом договора аренды и осуществление государственной регистрации права аренды на земельный участок в двухмесячный срок со дня принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка.

Лот № 2: заключение победителем аукциона с Браславским районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права аренды на земельный участок, получение правоудостоверяющих документов в Браславском бюро Полоцкого филиала РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на реконструкцию или строительство объекта в срок, не превышающий двух лет.

Лот № 3: заключение победителем аукциона с райисполкомом договора аренды и осуществление государственной регистрации права аренды на земельный участок в двухмесячный срок со дня принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка.

1. Аукцион состоится «10» сентября 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица, копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица, **без нотариального засвидетельствования;** индивидуальными предпринимателями – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, **без нотариального засвидетельствования;** иностранными юридическими лицами – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 09.09.2009 г. до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308**. Заключительная регистрация участников 10.09.2009 с 14.00 до 14.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

5. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 дней со дня принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения райисполкомом), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 3 миллиона рублей (по каждому лоту), расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; не позднее 12 дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

Пляменнікі прадалі дом

У майго мужа была сястра, якая памерла ў канцы мінулага года. Яна са сваёй сям'ёй жыла ў вёсцы ў доме, які застаўся пасля смерці іх бацькоў. Мой муж там прапісаны не быў, аднак часта наведваўся ў бацькоўскі дом, чым мог, дапамагаў сястры. Цяпер яе дзеці прадалі гэты дом. Ці маглі яны зрабіць гэта без згоды майго мужа?

Святлана, *г. Брэст*

Вы не паведамляеце ў сваім лісце, атрымліваў ваш муж пасля смерці сваіх бацькоў частку дома ў спадчыну, ці ўсё было аформлена на сястру. Напэўна, дом быў аформлены на сястру. Інакш пры афармленні здзелкі па яго куплі-продажы натарыус высветліў бы, што ў дома ёсць яшчэ адзін уласнік, і ваш муж атрымаў бы пісьмовае паведамленне пра гэта за месяц да продажу з прапановай купіць долю, якую атрымалі дзеці яго сястры ў спадчыну. Такое патрабаванне вызначана артыкулам 253 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Згодна з часткай першай гэтага артыкула, пры продажы долі ў праве сумеснай уласнасці пабочнай асобе астатнія ўдзельнікі долевай уласнасці маюць пераважнае права купіць долю на продаж па цане, за якую яна прадаецца, і на іншых роўных умовах.

Як вызначана артыкулам 123 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь, пры адчужэнні жылога памяшкання патрабуецца згода ўсіх поўнагадовых членаў сям'і ўласніка жылога памяшкання, якія пражываюць сумесна з ім і маюць права карыстання жылым памяшканнем, а калі ў гэтым жылым памяшканні жывуць няпоўнагадовыя

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (13 жніўня). Па гарызанталі: Партрэт. Пейзаж. Увал. Смех. Рад. Ікра. Топка. Норд. Юшка. Фал. Нанду. Паслуга. Ніт. Уфа. Раса. Павук. Манака. Самасад. Тот. Плакат. «Лада». Дама. Радар. Спад. Апосум. Гало. Вальс. Нацюрморт. **Па вертыкалі:** Турнэпс. Шпат. Проса. Анод. Вата. Фундук. Мараль. Крагі. Капа. Тлум. Лата. Стог. Вера. Штамп. Сан. Плаха. Акула. Душ. Санд. Моц. Мат. Танкер. Апала. Пандус. Сад. Фарада. Карыкатура. Дар.

КРЫЖАВАНКА-ТРАСЯНКА (15 жніўня). Па гарызанталі: 5. Веласіпед (мабільны транспарт у адну «чалавечую сілу»). 8. Каканду (чубаты папугай Аўстраліі, Новай Гвінеі, суседніх астравоў). 9. «Газель» (аўто Горкаўскага завода). 12. Фуэтэ (характэрны махавы рух нагі ў класічным танцы). 13. Цэлій (пералічаны ўсе сем узгорка Старажытнага Рыма). 14. Аверс (на выяве — аверс і рэверс манеты, выпушчанай у абарачэнне ў 2008 годзе). 17. Званіца (на здымку: званіца на браме ў пасёлку Ракаў паблізу Мінска). 18. Сталіца (герб Мінска на сталічнай ратушы). 19. Сметана (чэшскі кампазітар — аўтар названых опер). 21. Мазаіка (фрагмент аздобы царквы ў пасёлку Мір Гродзенскай вобласці). 25. Штамб. 26. Склад (як прыклад: слова, разбітае на склады). 27. Ралля. 30. Капіца П.Л. (1894—1984) — вядомы вучоны-фізік і папулярызатар навуковых ведаў. 31. Ананас. 32. Дарданэлы. **Па вертыкалі:** 1. Ветах (Месяц у апошняй квадры). 2. Кадуцэй (жазло ў Гермеса або ў яго старажытнарымскага «калегі» Меркурыя). 3. Пінгвін. 4. Медзь. 6. Кантон (федэратыўная адзінка ў Швейцарыі). 7. Блювал. 10. Куравіметр (прыбор для вымярэння даўжыні крывой лініі). 11. Трыцікале (гібрыд пшаніцы і жыта). 15. Сцэна. 16. Атрад. 20. Тампак (сплаў названых металаў). 22. Анабас (т.зв. паўзун; рыба, здольная пэўны час дыхаць атмасферным паветрам). 23. Актаэдр (правільны 8-граннік). 24. Каханне (пераклад слова з нямецкай мовы). 28. Міцар (зорка з прыведзенай характарыстыкай). 29. Раяль (адзін з варыянтаў інструмента).

Інфарм-укол

МЕНШ СНУ — БОЛЬШАЯ ТАЛІЯ

Апытанні паказваюць, што кожны другі жыхар мегаполіса спіць менш за 7 гадзін. Разавы недасып не страшны, а вось пры хранічным арганізм выходзіць з-пад кантролю.

Напрыклад, вы старанна сочыце за фігурай, аднак насуперак намаганням чамусьці набіраеце вагу. Прычына можа быць у банальным недасыпанні. Псіхіятры са Стэндфардскага ўніверсітэта ўстанавілі: сон менш за 5 гадзін у суткі прыгнятае выпрацоўку гармонаў, якія рэгулююць апетыт. Адсюль і лішнія кілаграмы.

Пры дэфіцыце сну арганізм выдае і іншыя сігналы бедства: раздражняльнасць, разумовае і фізічнае знясіленне, зніжэнне сэксуальнай актыўнасці. Так што высыпайцеся самі і сачыце за сном партнёра. Вучоныя з Цэнтра парушэнняў сну ў Мінесоце лічаць, што бяссонніца можа прывесці мужчын да такога расстройства, як сэксамнія: гэта калі партнёр у сне займаецца сэксам з жанчынай, якая спіць побач, а калі прачынаецца, нічога не памятае. Своеасаблівы лунацізм з сэксуальным падтэкстам.

ДЛЯ ПРЫЛІВУ СІЛАЎ

Каб адчуць сябе бадзёрым, пазбавіцца санлівасці, варта інтэнсіўна пацерці далоні адна аб адну або расцерці рукамі вушныя ракавіны, пакуль тыя не пачырванеюць і не сагрэюцца.

Гэтыя часткі цела багатыя на энергетычныя кропкі, уздзеянне на іх мабілізуе работу арганізма. Нядрэнна, дарэчы, масіраваць і ступні ног. І вазьміце на ўзбраенне правіла кропкавага масажу: 30-секуннае ўздзеянне пальцам на кропкі пад носам, паміж бровамі, пад ніжняй губой і ў цэнтры далоні гарантавана прынясе невялікае расслабленне.

ЗІРНУЦЬ У ВОЧЫ

У дашлюбнай сэксуальнай цязе вялікую ролю адыгрывае дапамін — рэчыва, рэзкі выкід якога адбываецца ў арганізме пасля шлюбу па прычыне змянення статусу маладых і новых умоў жыцця.

З гадамі ўзровень дапаміну знікаецца, і пара пачынае сумаваць у ложку. Сэксолагі мяркуюць, што выйсце ёсць, і прапануюць навучыцца гаварыць партнёру «так», не чакаючы пакуль абаіх напаткае моцнае жаданне. Паспрабуйце заводзіцца ад дотыку партнёра. А ў момант рэалізацыі сэксуальнага жадання глядзіце адзін аднаму ў вочы — гэта дазваляе адчуць сябе больш сэксуальнымі. І практыкуйце хуткі сэкс — ён падтрымлівае абаіх у тонусе, умацоўвае ўзаемнае пачуццё.

ФІЗІЧНАЯ НАГРУЗКА — ГЭТА КІСЛАРОД

Змяненне ладу жыцця ў бок большай актыўнасці можа быць разумнай альтэрнатывай фізічным практыкаванням.

Актыўны лад жыцця мае на ўвазе павелічэнне затрат энергіі на працягу дня, чаму спрыяе хада (замест паездкі на транспарце), пад'ём пешшу па лесвіцы (замест ліфта). Можна перастаць карыстацца пультам ад тэлевізара ці радыётэлефонам, каб мець магчымасць больш рухацца. Звярніце ўвагу на наступныя звесткі.

- Прагулка з сабакам — 30 хвілін — 100 ккал
- Прабежка — 20 хвілін — 500 ккал
- Хада пешшу — 20 хвілін — 150 ккал
- Пад'ём па лесвіцы — 10 хвілін — 100 ккал
- Генеральная ўборка кватэры — 120 хвілін — 300 ккал
- Гульні з дзецьмі на свежым паветры — 30 хвілін — 250 ккал
- Танцы — 30 хвілін — 300 ккал
- Плаванне ў басейне — 40 хвілін — 200 ккал
- Хатняя гімнастыка — 30 хвілін — 200 ккал.

Падчас практыкаванняў мы насычаем клеткі кіслародам і ўзнімаем энергетычны ўзровень арганізма за кошт паскарэння абмену рэчываў. Як толькі клеткі атрымалі порцыю кіслароду, з гэтага моманту пачынаецца спальванне тлушчу. Чым больш кіслароду, тым большая хуткасць метабалізму клетак, абменных працэсаў і, адпаведна, спальвання тлушчу ў арганізме.

Аэробныя нагрузкі карысныя для здароўя нават па-за залежнасцю ад іх уплыву на зніжэнне вагі. Насычэнне арганізма кіслародам, якое адбываецца падчас выканання практыкаванняў на вынослівасць, спрыяе зніжэнню рызыкі развіцця дыябету і сардэчна-сасудзістых захворванняў. Дыета ў спалучэнні з аэробнымі практыкаваннямі спрыяе таксама змяншэнню сімптомаў дэпрэсіі і стомленасці.

Акрамя таго, падчас фізічнай нагрузкі арганізм ачышчаецца ад метабалічных адходаў. Адмерлыя таксічныя клеткі павінны быць выдаленымі з арганізма, аднак пры нізкім узроўні фізічнай актыўнасці яны не атрымліваюць дастатковай колькасці кіслароду і даволі няспешна пакідаюць арганізм.

Дарэчы, для паляпшэння метабалічных працэсаў неабходна навучыцца і правільна дыхаць. Глыбокае і правільнае дыханне максімальна эфектыўна вызваляе клеткі ад таксінаў і дапамагае арганізму спальваць тлушч.

Можаце папрактыкавацца:

1. Пастаўце ногі на шырыні плячэй.
2. Зрабіце глыбокі ўдых жыватом праз нос і ўдыхніце Сілу Зямлі.
3. Адчуйце сувязь з Сілай Жыцця.
4. Глыбока выдыхніце, нібыта вы выдыхаеце ў гэты момант усе свае праблемы.
5. Падчас удыху можаце ўзнімаць рукі над галавой, а пры выдыху плаўна апускаць іх.

Даследаванні паказваюць, што той, хто рэгулярна займаецца фізічнымі практыкаваннямі, мае ўсе шанцы захаваць аднойчы зніжаную вагу.

Для падтрымання нармальнай вагі неабходна не менш за 1 гадзіну ў дзень хадзіць хуткім крокам або па 30 хвілін займацца аэробікай, ездзіць на веласіпедзе, бегаць.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

Занатоўкі мастака

Гарбузы

Гарбузы — назва вёскі, у якую я марыў з'ездзіць у дзяцінстве, а так і не выбраўся. У Гарбузы ездзілі нашы суседзі да сваіх сваякоў. Вярнуўшыся, суседзі распавядалі пра Гарбузы дзівосныя рэчы: і яблыкі тамака былі найсмачнейшыя, і слівы найсаладзейшыя, і грушы духмяныя-духмяныя. Наслухаешся такіх аповедаў, і Гарбузы ўяўляюцца райскім месцам на тутэйшай зямлі. Прасіць суседзяў, каб наступным разам узялі і мяне ў падарожжа, было няёмка, таму я вырашыў адкласці вандроўку ў Гарбузы. Вось вырасту і абавязкова туды паеду, каб пакаштаваць тамтэйшыя яблыкі, слівы і грушы. Не паехаў і, пэўна ж, не паеду, каб не разбураць казку, пачутую ў дзяцінстве, казку пра райскае месца на зямлі, казку пра вёску Гарбузы.

Адно сэрца

Адзін вельмі далёкі ад нас, беларусаў, народ пэўны час пражыў пад лозунгам «Сто мільёнаў — адно сэрца!». Ці маглі б беларусы жыць пад падобным лозунгам? Ці можам мы сказаць «Дзесяць мільёнаў — адно сэрца!»? Мусіць, не можам. Рызыкоўна. Жыццё пад такімі лозунгамі вядзе да катастрофы. Адно сэрца лягчэй спыніць, чым дзесяць мільёнаў нашых асцярожных сэрцаў...

Торт і сэрца

Дваццаць пяць гадоў цешча пякла мне на дзень нараджэння торт «Сэрца паэта». Насамрэч гэта быў торт «Напалеон» у выглядзе вялікага сэрца. У маёй цешчы атрымліваўся найсмачнейшы торт у свеце, можаш мне паверыць. У сераду сэрца цешчы спынілася, у чацвер яе адвезлі ў крэматорый. Каля труны і за жалобным сталом сваякі згадвалі торт «Сэрца паэта», згадвалі яе любоў да мяне. Балюча губляць не толькі тых, каго любіш ты, вельмі балюча губляць і тых, хто моцна любіў цябе.

Недачытаныя кнігі

Ёсць кнігі, якія немагчыма дачытаць, і не таму, што ты не здатны прачытаць увесь тэкст ад першай да апошняй старонкі, а таму, што дачытаўшы апошні сказ, ты пачынаеш перачытваць кнігу зноў. Неабавязкова перачытванне пачынаецца адразу, ты можаш вярнуцца да прачытанага і праз пяць, і праз дзесяць гадоў. Такія кнігі падаюцца бясконцымі. Асабіста ў мяне падобных кніжак нямнога. Ёсць сярод іх агульная вядомыя: «Быццё» і «Эклезіяст» з Бібліі, «Паэтыка» Арыстоцеля і «Характары» Феафраста, «Хоку» Басё і «Запіскі каля ўзгалоўя» Сэй-Сёнагон. Ёсць і беларускія кнігі, да якіх я звяртаўся шматкроць: «Вянок» Багдановіча і «Тутэйшыя» Купалы. Ёсць кнігі, якія, спадзяюся памыліцца, выглядаюць бясконцымі толькі для мяне: «Міг бліскавіцы» Адамчыка і «Ядлоўцавы куст» Стральцова. Усе гэтыя бясконцыя кнігі дапамагаюць мне ў хвіліны смутку і адчаю.

Цудоўныя рэчы

Ёсць выдатныя рэчы, на якія мне давялося паглядзець у сваім жыцці. Некаторыя з іх вартыя таго, каб палюбавацца імі яшчэ раз. Піраміды фараонаў у Гізе, яны нібыта вылепленыя са светла-залацістай халвы... Вялікія лялькі, што танчаць на плошчах святочнай Барселоны ў стракатым і гаманкім натоўпе... Палотны венецыянца Тыцыяна «Святы Себасцьян» і «Уцёкі ў Егіпет» на сценах невялікай залы Эрмітажа, што мокне пад дажджамі ў паўночна-шэрым Санкт-Пецярбургу... Бліскуча-белая квадратная ванна ў вясёлым доме вечна-начнога і вечна-салодкага Бангкока... Надмагільная тумба Цыцэрона, што праплывае за акном цягніка, які няспешна ідзе з Неапаля ў Рым... Рымскія фантаны... Так бы лічыў і лічыў, згадваў і пералічваў цудоўныя рэчы, на якія я паглядзеў.

Маленькае задавальненне

У бальніцы я не мог ноччу ўключаць святло. Дома, у гадзіны бяссоння, запальваю настольную лямпу і чытаю, пакуль сон не зморыць мяне. У бальнічнай палаце я ляжаў без сну ў цемрадзі і думаў, што, нават маючы лямпу, я ўсё адно не змагу чытаць, бо моцна баляць вочы. Цяпер я зноўку вярнуў сабе начное чытанне, і шчаслівы.

Перахопленае дыханне

Уздымаешся на высокі будынак, выходзіш на дах, падыходзіш на край, і маленечкі камень, падбіты мыском чаравіка, ляціць уніз. І адкуль толькі на дахах самых высозных будынкаў бяруцца тыя каменьчыкі?! Ты, нібыта прывязаны да каменьчыка, сочыш за падзеннем. У такое імгненне, хочаш не хочаш, а дыханне тваё спыніцца... Дзіця выбегла на дарогу. Машыны яшчэ далёка, тры разы ты паспееш дагнаць сваё дзіця і вярнуць на бяспечны тратуар, але дыханне ў цябе раз і перахапіла... Пачуеш у тэлефоне благую вестку пра здароўе любімага чалавека, змоўкнеш, знямееш, бо сэрца скамянела і дыхання няма...

Адам ГЛОБУС.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.55	20.31	14.36
Віцебск —	5.40	20.24	14.44
Магілёў —	5.44	20.21	14.37
Гомель —	5.45	20.13	14.28
Брэст —	6.11	20.45	14.34
Гродна —	6.16	20.41	14.25

Месяц

Маладзік 20 жніўня.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *ДРУГІ СПАС (Праабражэнне Гасподняе).*

К. *Канстанцыі, Андрэя, Юльяна, Яна.*

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА +24..+26°C	КІЕЎ +18..+20°C	РЫГА +21..+23°C
ВІЛЬНЮС +21..+23°C	МАСКВА +12..+14°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ +16..+18°C

Дзве даты

19 жніўня

1876 год — заснавана Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі. Гэта была арганізацыя буйных беларускіх землеўладальнікаў. У яе ўваходзілі абшарнікі К. Чапскі, М. Валовіч, С. Свянціцкі, Э. Вайніловіч і інш. Таварыства мела 4 секцыі: агранамічную, па жывёлагадоўлі, па конегадоўлі і лясную. У маёнтках праводзіліся вопыты па даследаванні стану і ўмоў мясцовага паляводства і лугаводства, вывучаўся перадавы сусветны вопыт. Пра вынікі працы паведамлялася ў навуковых дакладах. У 1897 годзе пры таварыстве было створана камерцыйнае аддзяленне, якое дзейнічала як сіндыкат па збыце прадукцыі і дастаўцы сельскагаспадарчых машын. У лік найбуйнейшых аперацый, якія выконваліся сельскагаспадарчым таварыствам, уваходзілі пастаўкі збожжа ваеннаму ведамству непасрэдна ад землеўладальнікаў. Іншай важнай аперацыяй з'яўляўся продаж ячменю піваварным заводам Пецярбурга і Масквы. У сферу інтарэсаў таварыства ўваходзіў і гандаль лесам. Вялікая ўвага надавалася жывёлагадоўлі. Многія члены таварыства мелі ўласныя конезаводы, буйную рагатую жывёлу. Таварыства распасцірала сваю дзейнасць на ўсе сферы эканомікі, звязаныя з сельскай гаспадаркай.

1936 год — у Маскве праходзіў судовы працэс па справе так званага трацкісцка-зіноўеўскага «Аб'яднанага цэнтра» («Антысавецкі аб'яднаны трацкісцка-зіноўеўскі цэнтр»). Па справе былі прыцягнуты 16 чалавек, сярод іх — Р. Зіноўеў, Л. Каменеў, Р. Еўдакімаў. Усе падсудныя былі прыгавораны да расстрэлу. У 1988 годзе Пленум Вярхоўнага Суда СССР прысуд адмяніў і справу спыніў за адсутнасцю ў дзеяннях асуджаных складу злачынства.

Цытата дня: *«Самая вялікая галеча — нявыхаванасць».*

Алі-ібн Абі-Таліб (600—661), арабскі паэт.

19 жніўня — Другі Спас: Яблычны, Спасаўка, Іспас

Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйшоў Ілья — апала два, прыйшоў Спас — пайшло лета ад нас.
Калі буслы не адлятаюць да Спаса, то зіма будзе мяккая і цёплая.
Прыйшоў Іспас — бяры рукаўкі ў запас.
Другі Спас шубу прыпас.
Які другі Спас, такі і студзень.

Яблычны Спас. У абрадавай практыцы славян ушанаванне яблыкаў знайшло адлюстраванне ў адным з галоўных святаў, якое заканчвала цыкл летніх сельскагаспадарчых работ. Старадаўнія паданні сведчаць, што ў дзень Яблычнага Спаса Гасподзь адорвае душы ўсіх памерлых дзяцей райскімі яблыкамі — першымі пладамі новага ўраджаю.

- Адсюль узнікла рэгламентуючае правіла ў жыцці жанчын, у якіх памерлі дзеці. Ім забаранялася есці яблыкі новага ўраджаю да Яблычнага Спаса, каб спачатку «на тым свеце» Гасподзь пачаставаў дзетак райскімі яблычкамі, і толькі пасля гэтага жанчыны маглі есці яблыкі самі. Таму жанчыны, якія страцілі дзяцей, раніцай 19 жніўня павінны былі сарваць некалькі яблыкаў, аднесці іх у храм, асвяціць, занесці на могілкі і пакласці на магілы памерлых дзяцей і толькі пасля гэтага маглі есці іх самі. У тым выпадку, калі магіла дзіцяці далёка ці нават невядома дзе знаходзіцца, неабходна было асвечаны яблык пакласці на любую дзіцячую магілу ці пакінуць іх у храме.
- Існавала павер'е, што на тым свеце дзецям, бацькі якіх да Другога Спаса не ядуць яблыкі, даюць падарункі (сярод якіх і райскія яблыкі), а тым дзецям, бацькі якіх пакаштавалі яблыкаў — не. Таму бацькі, асабліва тыя, у якіх памерлі дзеці, лічаць вялікім грахом есці яблыкі да Другога Спаса.
- У гэты дзень асвечаныя яблыкі неслі на могілкі і клалі на магілы ўсім памерлым продкам.
- У гэты дзень у царкве асвячалі плады новага ўраджаю, мёд, хлебнае калоссе: «Спас — усяму час». І сёння ад старых людзей можна пачуць: да Другога, Яблычнага Спаса, нельга есці ніякіх пладоў, акрамя агуркоў. І толькі пасля асвячэння ў храме дазваляецца ўжываць у ежу яблыкі, грушы, слівы і інш. Асвечаныя каласы і насенне захоўвалі да наступных засевак.
- У старадаўнія часы ў вёсках і гарадах было прынята ў гэты дзень везці вазамі яблыкі ў царкву. Каля цэрквяў доўгімі радамі стаялі яблычныя падводы, узнікалі яблычныя базары, кірмашы. Святары выходзілі і асвячалі яблыкі ў вазах і яблычных гандлёвых радах.
- Здавён вядома традыцыя, калі багатыя людзі, якія мелі вялікія сады, частавалі яблыкамі бедных, хворым дасылалі іх да хаты. З тымі, хто не выконвае гэтага звычаю, грэбавалі нават размаўляць.
- У дзень Яблычнага Спаса запякалі яблыкі, пяклі пірагі, бліны з яблыкамі, грыбамі і ягадамі — з усім, чым адорвае нас агарод, сад, лес. Пірагі для гэтых святаў пяклі заўсёды з поснага цеста.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Я ўчора абсалютна не напіўся, кажуць...

☺

Калі ў вас у машыне дзяўчына, якую вы падвозілі, пакінула сумачку з немалой сумай грошай, аддаваць якую шкада, а вы чалавек сумленны, то ўсё ж дайце абвестку ў газету, але ў асноўных прыкметах пасажыркі пазначце, што яна была непрыгожая.

☺

У краме:
— У вас ёсць доктарская каўбаса?
— Не! Але ёсць кандыдацкая!

Два полюсы

ТЫ ТАТА АБО ХТО?

Або я нешта не разумею, або нашы беларускія жанчыны хочуць неверагоднага. Гэта я наконт таго, што, бывае, скардзяцца многія маладыя (і не толькі) маці, што тата пасля нараджэння дзіцяці часцей за ўсё толькі адзначыць гэтую падзею ў коле сяброў, а потым і не вельмі стараецца дапамагаць жонцы гадаваць дзіця. Маўляў, я грошы зарабляю, і што ты хочаш ад мяне? — мужчынская логіка. Пры гэтым яшчэ доўга пры сустрэчах са знаёмымі будзе ганарыцца, што ў яго сын (дачка) нарадзіўся...

Падзялюся некаторымі думкамі. Па-першае, маленькаму чалавеку ніхто так не патрэбны, як маці. Што, тату грудзьмі карміць малога? Фізічна немагчыма. Мабыць, і пра гэта жанчыны мараць? Ды і псіхалагічна, эмацыянальна (не хадзі да спецыялістаў па псіхалогіі і экстрасэнсаў) немаўля залежыць менавіта ў першую чаргу ад маці. Зразумела, ад таты таксама, але не так, як ад яе. І ўсё жыццё так. «Мама» — слова святое! Ну, не веру, што калі каму-небудзь з нас вельмі бывае балюча ўжо і ў дарослым узросце, нехта спантанна закрычыць: «Татачка, мне дрэнна!»

Па-другое. Дэкрэтны водпуск і даецца спецыяльна, каб маці гадавала дзіця. І грошы за гэта плацяць. На жаль, у нашай краіне плата за догляд дзіцяці (спадзяюся, пакуль што) невялікая. Напэўна, тыя, хто вызначае яе штомесячны памер, самі не атрымліваюць такі мізэр? Што парламентарыі, якія атрымліваюць, калі не памыляюся, міністэрскія зарплаты, калі знаходзяцца ў дэкрэце, атрымліваюць столькі ж, як і іх выбаршчыцы — маці ў дэкрэце? А калі і столькі ж, ну, не параўнаць зарплату міністра з, напрыклад, эканамістам у радавой установе. Падсабраць можна грошы.

Прызнаюся шчыра, што я асабіста таксама не ўваходжу ў пералік ідэальных бацькоў. Праўда, выпівалі мы і, шчыра, — вельмі сімвалічна толькі пасля нараджэння майго першага сына. А другому «не пашанцавала» — лішняга часу ды і грошай бацька ягоны не знайшоў, каб адсвяткаваць факт нараджэння.

Дзеці, калі ім гадоў да двух — «механізм складаны», крычыць, калі нешта не падабаецца. І чаго хоча? Маці амаль што адразу зразумее — на тое яна і маці.

Пісаць хочаш? — пытаю на вуліцы малога, як папугай. Маўчыць. І тут — вось сюрпрыз, татачка, напісаў у штаны. А надвор'е не цёплае. Захварэе, не дай божа. У выніку маці ягоная крычыць: ты ж што, не мог пракантраляваць? А чаму ты яго не можаш пакарміць? Я ж магу! Ты — тата, або хто? — пытае зноў маці маіх дзяцей.

А калі дзіця будзе выпадкова падаць, што потым распачнецца з боку яго маці! Пры гэтым пры ёй і падаў, і біўся. А вы кажаце — чаму мужчына «на адлегласці» стараецца быць?

Міні-апытанне па тэме маіх знаёмых мужчын толькі пацвердзіла тое, што я ў свой час зразумеў дакладна. Калі б жанчыны меней эмацыянальна рэагавалі на памылкі мужчын у дробязях, што датычацца іх стасункаў з дзецьмі (пра тыя ж мокрыя штаны), болей бы ахвотна мужчыны і выхоўвалі малых. Майму старэйшаму хутка будзе пяць. З ім, вядома ж, прасцей. Але калі што не так (зноў жа ўпаў і гэтак далей), хто вінаваты? Бацька! А калі нешта яму не спадабаецца, яшчэ і паскардзіцца маці сваёй. Вось і думай: ці паехаць лішні раз у камандзіроўку, ці больш быць з дзецьмі? А іх я вельмі люблю, як і іх маці. І стараюся больш зарабіць, каб многае было ў іх з таго, што яны хочуць. Лепш так «гадаваць» дзяцей, чым ніяк?

Тата дваіх дзяцей Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ТАТАЎ МНОГА. АДКАЗНАСЦІ МАЛА!

Наколькі я разумею, пасля гэтай сціплай прыпіскі — «тата дваіх дзяцей» — мне застаецца схіліць галаву і спыніць дыскусію. Інакш усе мае аргументы будуць разбівацца аб жалезнае «Вось з'явіцца свае, тады і пагаворым». І ўсё ж мне ёсць што сказаць. Прычым, у адрозненне ад цябе, Саша, я прапаную пачаць не з прыватнага, а з агульнага.

Адкажы шчыра — ці многа ты ведаеш маці-адзіночак? Мне, каб прыгадаць некалькі чалавек, можна не пакідаць не тое што межаў рэдакцыі, але і з уласнага пад'езда не выходзіць. У цябе, упэўнена, таксама знойдзецца, пра каго ўзгадаць. А... татаў, якія адны выхоўваюць адно, дваіх і больш дзяцей — многа назавеш? Асабіста я ведаю толькі аднаго — хударлявага, негераічнага на выгляд Аляксандра Артамонава з Салігорска, які тым не менш самааддана выхоўвае 4 прыёмных сыноў. Ну, дык яго ці не ўся Беларусь ведае, і ён якраз з тых выключэнняў, якія толькі пацвярджаюць правіла. А ненармальная рэчаіснасць у тым, што маці-адзіночкі — гэта ўжо тэндэнцыя, іх надзвычай многа, і далёка не ўсе яны свядома прымалі рашэнне аб такой «незалежнасці».

Ты сцвярджаеш на гэта — «маленькаму чалавеку ніхто так не патрэбны, як маці». У першыя месяцы жыцця — так. Але ёсць і сустрэчная аксіёма: маці ў гэты час патрэбны чалавек, на дапамогу і падтрымку якога яна заўжды зможа разлічваць, бо яе псіхалагічны стан, будзе гэта раздражнёнасць ці спакойная радасць, вокамгненна перадаецца немаўляці. І хто, па-твойму, павінен ролю гэтага чалавека выконваць — няўжо не тата?

Ідзём далей. Дэкрэтны водпуск. Можа, для цябе гэта будзе адкрыццём, але ён не даецца «спецыяльна, каб маці гадавала дзіця» — паводле Працоўнага кодэкса, водпуск па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім 3 гадоў узяць можа як маці, так і тата, і бабуля або дзядуля. Гэта на паперы. А ў жыцці сітуацыя, як заўжды, іншая — паводле звестак ЮНІСЕФ у Беларусі, у дэкрэтны водпуск сыходзіць усяго каля 1 % беларускіх татаў. Летась па ўсёй краіне іх было прыкладна 1500 чалавек. Для параўнання — у заходніх краінах гэта лічба дасягае 25 %. З чаго б? Самы відавочны варыянт — бо мужчыны, здабытчыкі і абаронцы, дагэтуль зарабляюць значна больш, чым жанчыны. Так, ды не так — у фемінізаванай журналістыцы, напрыклад, як і ў банкаўскай справе або юрыспрудэнцыі, жанчыны атрымліваюць добрыя грошы (часам у 1,5 раза больш за мужоў). А ў дэкрэт чамусьці ідуць усё ж яны. Або не ідуць увогуле, ужо праз месяц вяртаючыся да паўнавартаснай работы і абвяргаючы меркаванне, што толькі Гай Юлій Цэзар мог рабіць некалькі спраў адначасова. Дык мо справа не ў грашах, а ў зручнай пазіцыі «ты маці, ты лепш разумееш, чаго ён хоча, ты і выхоўвай»?

Калі вярнуцца з агульнага зноў да прыватнага... Ведаеш, калі маленькаму чалавечку проста сумна, адзінока або страшна, або хочацца пагуляцца — яму абсалютна ўсё адно, хто возьме яго на рукі, абы гэтыя рукі трымалі моцна і ласкава. Праверана на маёй паўгадавалай пляменніцы. А ўсе спасылкі на псіхолагаў і асцярожныя разважанні, што немаўляці больш патрэбная мама — гэта самападман. Дзіцяці жыццёва неабходныя абодва бацькі — менавіта ад іх малое атрымлівае першыя ў жыцці ўрокі чалавечых стасункаў. А маме і тату неабходныя ўзаемаразуменне, цярпенне і гатоўнасць несці вялікую адказнасць. Бо дзіця не «заводзіць», як шчанюка ці сабачку. Яго нараджаюць і выхоўваюць як мінімум два чалавекі, незалежна ад таго, хто ў доме галоўны. Без усякіх «калі б», «калі яна, то я...» і іншых умоўных канструкцый.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №УМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 4498. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12